

Калі гараджане будуць зайздросціць вяскоўцам

МС



Як засцерагчыся ад махляроў?

СТАР. 3



Музыка нараджаецца… на бальнічным ложку

СТАР. 4

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

10 СНЕЖНЯ 2014 г. СЕРАДА № 234 (27844) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## АДКРЫТЫ ДЫЯЛОГ ПА ЎСІХ ПЫТАННЯХ

### Такі фармат адносін — самы дастойны для саюзнікаў

**Пасяджэнне Вышэйшага дзяржаўнага савета Саюзнай дзяржавы ў канцы снежня адбудзецца ў Маскве. Пытанні падрыхтоўкі да яго абмяркоўваліся на сустрэчы Прэзідэнта Беларусі, старшыні ВДС Саюзнай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі з дзяржаўным сакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам, паведамляе БЕЛТА.**

Бакі абмеркавалі тэмы, якія будуць вынесены на разгляд на вышэйшым узроўні, а таксама звязаныя з імі пытанні. Канкрэтная дата правядзення пасяджэння пакуль не вызначана.

Па словах Аляксандра Лукашэнкі, «з'явілася некаторае рознагалоссе» ў сувязі з прапановай, каб 23 снежня правесці ў адзін дзень значныя мерапрыемствы — на ўзроўні АДКБ, Еўразійскага эканамічнага саюза, а таксама Вышэйшага дзяржсавета. «Калі праводзіць, то трэба рабіць гэта грунтоўна. Мы і так ужо перад людзьмі і ў Расіі, і ў Беларусі не вельмі прыстойна выглядаем з фарміраваннем паўнавартаснай Саюзнай дзяржавы, а яшчэ ў фармалізм ператвараць наша мерапрыемства, напэўна, будзе няправільна», — лічыць Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт адзначыў, што хацеў бы пачуць пункт гледжання Рыгора Рапоты як дзяржсакратара па гэтых пытаннях. «Тым больш што (вы гэта ведаеце; дзякуй, што прымаеце ўдзел у вырашэнні гэтых пытанняў) з'явілася шмат тэм, якія трэба разгледзець, у беларуска-расійскіх адносінах. Самыя цесныя адносіны дзвюх дзяржаў, двух народаў, і мы сёння вымушаны канстатаваць, што ствараем праблемы на роўным месцы, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Мне здаецца, расіянам няма ў чым нас папракнуць. Мы робім усё, як дамовіліся».

Закранаючы тэму паставак беларускай прадукцыі ў Расію, Прэзідэнт падкрэсліў: «Вы нас папрасілі паставіць вось гэтыя аб'ёмы малочных і мясных прадуктаў, рыбы і гэтак далей, усё распісалі. Дык яшчэ гэтыя квоты не выбраны, мы яшчэ не паставілі гэтыя аб'ёмы. Што ж нас папракаць, што мы ўжо вельмі перакармілі вас, расіян. І потым, гэта наогул несур'ёзна. Мы вось на гэтую тэму мала звяртаем увагі, але гэта не значыць, што яна не існуе. Гэта не тое што нядобрасумленная канкурэнцыя. Гэта наогул наш брат родны (расіяне), ён жа не проста не пускае нашу прадукцыю — стварае ёй антырэкламу».

Аляксандр Лукашэнка канстатаваў, што ў Беларусі захавалі савецкія ДАСТы, зрабілі іх больш строгімі. «Расія даўно ўжо забыла, што такое ДАСТы, там нейкія ТА, тэхнічныя рэгламенты або ўмовы. Зразумела, што кожны для сябе іх стварае. Ну і потым, на прылаўку ляжаць розныя прадукты — з Еўропы, Амерыкі, Расіі, Казахстана і Беларусі. Няхай расіяне разбіраюцца, што купляць. Мы — за гэтую канкурэнцыю, нам і ў гэтым адмаўляюць», — сказаў Прэзідэнт.

«Таму назапасілася шмат праблем, якія трэба вырашаць. І ўзяць у адзін дзень правесці мерапрыемствы — проста ўсё ў кучу паскідаем і вынікаў не атрымаем», — лічыць кіраўнік дзяржавы.

Ён выказаўся за адкрыты дыялог з расійскім бокам па ўсіх пытаннях: «Цямніць нам няма чаго адзін перад адным. Цяпер сітуацыя не тая, каб гуляць у нейкія дыпламатычныя гульні, нейкія хітрыкі».

У сваю чаргу, Рыгор Рапота згадзіўся з Прэзідэнтам Беларусі, што назапасілася шмат пытанняў, якія трэба грунтоўна абмяркоўваць. «Ёсць пра што гаварыць, і трэба хутка знаходзіць рашэнні і знімаць гэтую напружанасць. Існуе і шэраг іншых пытанняў, якія патрабуюць сістэмнага падыходу і адкрытага дыялогу», — адзначыў дзяржсакратар.

## Снежаньскі правапіс



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

ЦЫТАТА ДНЯ



**Намеснік старшыні Беларускай гандлёва-прамысловай палаты Уладзімір УЛАХОВІЧ:**

***— Бізнес значна раней, чым палітыкі, убачыў у Беларусі надзейнага, стабільнага і ўстойлівага партнёра. Больш за тое, еўрапейскі бізнес падштурхоўвае палітыкаў, каб яны ўсё-такі мянялі свае кансерватыўныя і штучныя падыходы, якія ў дачыненні да Беларусі не працуюць. Змены ў палітычных узаемаадносінах ужо назіраюцца. Што тычыцца эканамічнага плана, то мы працавалі і будзем працаваць. І нашы партнёры ў Еўропе, якія стаяць на прагматычных пазіцыях, разумеюць, што Беларусь — гэта дзяржава, з якой трэба працаваць.***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 10.12.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10850,00 | ▲ |
| Еўра | 13370,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 200,00 | ▼ |
| Укр. грыўня | 698,65 | ▲ |

## СВАЁ І ЯКАСНАЕ

### Айчынная вытворчасць лекаў павінна быць на ўзроўні сусветных стандартаў

**Такую задачу паставіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, прымаючы з дакладам міністра аховы здароўя Васіля Жарко, паведамляе БЕЛТА.**

Кіраўнік дзяржавы нагадаў аб дамоўленасці да канца 2015 года мець у краіне мінімум 50% лекаў уласнай вытворчасці. Пры гэтым ён падкрэсліў, што лекі павінны адпавядаць сусветнаму ўзроўню: «Нам іншыя лекі не патрэбныя, беларуская вытворчасць лекаў павінна быць на ўзроўні сусветных стандартаў».

«І наступнае — продаж на экспарт гэтых лекаў. Калі яны будуць па якасці горшыя, у нас жа не купяць ні ў Расіі, ні ва Украіне, ні ў Еўразійскім эканамічным саюзе, а тым больш у Еўрасаюзе. Таму павінна быць не менш за 50% і высокай якасці», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Таксама Прэзідэнт запатрабаваў у міністра «жалезна навесці парадак» у тым ліку і з водпускам лекавых сродкаў у аптэках.

■ Парламенцкі дзённік

## БУРАКІ І КАПУСТА ЗАМЕСТ МАНГА І АПЕЛЬСІНАЎ?

### Харчовая бяспека — не толькі калі ёсць што есці

**Цяпер паліцы магазінаў і гіпермаркетаў забіты любымі прадуктамі і на любы густ. Аднак, як вядома, не заўсёды яны карысныя. Шматлікія дабаўкі і напаўняльнікі, можа, і робяць ежу больш смачнай, але гэтая смаката не на карысць здароўю. Удзельнікі «круглага стала» ў Палаце прадстаўнікоў «Праблема здаровага харчавання насельніцтва Рэспублікі Беларусь» упэўнены, што часта людзям проста не хапае інфармацыі аб правільным харчаванні.**



Фота БЕЛТА.

Так, напрыклад, многія рэгулярна купляюць трапічную садавіну, думаючы, што гэта — надзейная крыніца вітамінаў. Магчыма, у цэлым яны маюць рацыю, але яшчэ больш гэтых жа вітамінаў можна атрымаць з таго, што вырасла ў нас. Вядучы «круглага стала» **дэпутат Мікалай ІВАНЧАНКА, старшыня міжведамаснай рабочай групы па каардынацыі дзейнасці, звязанай з пытаннямі харчавання,** упэўнены, што наладжванне правільнай сістэмы харчавання ў краіне патрабуе пастаяннага ўзаемадзеяння розных дзяржаўных органаў.

#### ПАДМУРКІ СПАЖЫВЕЦКАЙ ГРАМАТНАСЦІ

— Сучасная сістэма харчавання ўказвае на тое, што ў нашай краіне, як і ў многіх іншых, з'явілася іншая праблема — лішняй вагі, — адзначыў Мікалай Іванчанка. — Другая міжнародная канферэнцыя па харчаванні, якая праходзіла ў мінулым месяцы ў Рыме і была арганізавана Сусветнай арганізацыяй аховы здароўя і Міжнароднай харчовай арганізацыяй, паказала, што 500 мільёнаў чалавек у свеце пакутуюць ад лішняй вагі; пры гэтым 800 мільёнаў людзей галадаюць.

А ў беларусаў ёсць усе ўмовы харчавацца здарова і правільна.

— Замежныя спажыўцы галасуюць сваім кашальком за беларускую прадукцыю, — заявіў Мікалай Іванчанка. — Іншая справа, што мы самі вельмі выбіральна павінны падыходзіць да выкарыстання розных імпартных прадуктаў на нашай тэрыторыі. Гэта сур'ёзная тэма, таму што ў многіх імпартных прадуктах прысутнічаюць розныя дабаўкі, напаўняльнікі, паляпшальнікі смаку, празмерная колькасць транстлушчаў, розныя Е-кампаненты, якія правакуюць празмерны апетыт, прывыканне да прадуктаў. Трэба выбудаваць граматную сучасную сістэму харчавання, арганізаваць інфарміраванне шырокіх слаёў насельніцтва па правільным харчаванні.

СТАР. 2

■ Не прапусціце!

## Свята для кожнага

### 500 мерапрыемстваў і 15-хвіліннае музычна-піратэхнічнае шоу змогуць паглядзець мінчане і госці сталіцы.

**Святкаванне Каляд і Новага года ў сталіцы абяцае быць маштабным і багатым на разнастайныя мерапрыемствы. Аб дэталях падрыхтоўкі да любімых мінчанамі свят расказаў Сяргей МЯДЗВЕДЗЕЎ, намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінгарвыканкама.**



Фота БЕЛТА.

— Мінск падышоў да старту навагодніх і калядных мерапрыемстваў — адных з самых важных, кранальных і чароўных свят у нашым жыцці, якія гарадскія ўлады заўжды імкнуцца зрабіць асаблівымі і непаўторнымі,— кажа Сяргей Мядзведзеў. — Адным з асноўных месцаў канцэртна-забаўляльнай праграмы ў навагоднюю ноч стане пляцоўка каля Палаца спорту. Яна будзе працаваць з 23.00 да 4.00.

СТАР. 2

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Сацыяльная няроўнасць вядзе да страт ВУП

Арганізацыя эканамічнага супрацоўніцтва і развіцця (АЭСР) канстатуе, што ў краінах, якія ўваходзяць у яе, самы высокі ўзровень адрознення паміж багатымі і беднымі за апошнія 30 гадоў. «У зоне 34 краін арганізацыі даходы 10% насельніцтва, што адносіцца да самай багатай групы грамадзян, цяпер у 9,5 раза пераўзыходзяць даходы 10% насельніцтва з групы самых бедных», — гаворыцца ў справаздачы. У 1980-я гады паказчык суадносін быў роўны сямі. Найбольш моцным разрыў у становішчы гэтых дзвюх груп насельніцтва аказаўся ў ЗША, Фінляндыі, Ізраілі, Новай Зеландыі і Швецыі, адзначаецца ў даследаванні. У найменшай меры гэта праявілася ў Францыі, Бельгіі і Нідэрландах. Як падкрэсліваецца ў справаздачы, узмацненне няроўнасці ў даходах адмоўна адбіваецца на росце эканомікі. Так, гэтая з'ява прывяла да страты больш за 10% тэмпаў развіцця Мексікі і Новай Зеландыі, прыкладна 9% ВУП страцілі Вялікабрытанія, Фінляндыя і Нарвегія, 6-7% — ЗША, Італія і Швецыя.

### У Кітаі выпрацоўваюць электраэнергію з выведзеных з абарачэння банкнотаў

Кітайскія энергетычныя кампаніі пачалі выкарыстоўваць выведзеныя з абарачэння старыя і пашкоджаныя купюры для выпрацоўкі электраэнергіі ў гарадской акрузе Лаян на захадзе правінцыі Хэнань. Ініцыявала гэты эксперымент аддзяленне Цэнтральнага банка КНР у горадзе Чжэнчжоў. Паводле папярэдніх разлікаў, спальванне старых банкнот дазволіць вырабіць каля 1,3 млн кілават-гадзін электраэнергіі ў год і сэканоміць 4000 тон вугалю, паведамляе газета «Жэньмінь жыбаа». Пасля драбнення ў мясцовых банкаўскіх філіялах грашовая маса паступае ў распараджэнне энергетычных кампаній. Кожная тона грашовых знакаў дазваляе генерыраваць энергію на ўзроўні 660 кілават-гадзін. Працэс спальвання купюр фіксуецца на камеры.

### «Сцяна» на мяжы з Расіяй абыдзецца Украіне ў паўмільярда долараў



На будаўніцтва «Сцяны» на мяжы Украіны з Расіяй будзе выдаткавана 8 мільярдаў грыўняў (звыш 500 мільёнаў долараў). Як паведаміў прэм'ер-міністр краіны Арсеній Яцанюк, на рэалізацыю праекта спатрэбіцца чатыры гады. У канцы лістапада Дзяржпагранслужба Украіны прызнала, што больш за 400 кіламетраў расійска-ўкраінскай мяжы знаходзіцца па-за яе кантролем. Праект «Сцяна» быў анансаваны ў верасні 2014 года. Умацоўваць мяжу з РФ будуць з выкарыстаннем процітанкавых равоў, металічнага плота з калючым дротам, а таксама розных фартыфікацыйных збудаванняў. Украінскі ўрад разлічвае, што ўзмацненне мяжы паспрыяе адмене візавага рэжыму з ЕС.

ISSN 1990 - 763X

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### Курэнне пазбаўляе мужчын Y-храмасомы і скарачае жыццё



Папярэдняе даследаванне паказала: страта Y-храмасомы ў клетках крыві павышае рызыку развіцця раку. У новым даследаванні навукоўцы з Універсітэта Упсалы шукалі фактары, якія прыводзяць да страты Y-храмасомы. Яны выказалі здагадку, што да такіх фактараў могуць адносіцца ўзрост, ужыванне алкаголю, артэрыяльны ціск, дыябет і курэнне, распавядае Science World Report. Спецыялісты прааналізавалі ўзоры крыві больш за 6000 пажылых мужчын. Яны заўважылі, што ў 15% мужчын ва ўзросце 70 гадоў і старэй не хапала як мінімум 10% Y-храмасомы. Страта Y-храмасомы ў 2-4 разы часцей сустракалася сярод курцоў. Даследчыкі ўлічылі такія фактары, як высокі крывяны ціск, дыябет, залішняя вага і адсутнасць фізічных практыкаванняў. Курэнне было звязана са стратай Y-храмасомы менавіта ў пажылым узросце. Адкрыццё можа растлумачыць, чаму курэнне часцей выклікае рак у мужчын і чаму жанчыны, як правіла, жывуць даўжэй.

КОРАТКА

**Прафіцыт знешняга гандлю таварамі і паслугамі за дзесяць месяцаў 2014 года склаў $797,7 млн. За аналагічны перыяд 2013 года сальда знешняга гандлю таварамі і паслугамі было адмоўным і складала $1,4 млрд.**

Беларускі бок упэўнены, што большасць прадпрыемстваў, прадукцыя якіх цяпер забаронена для ўвозу ў Расію, могуць аднавіць пастаўкі ўжо ў гэтым месяцы. Такое меркаванне выказаў дырэктар дэпартамента ветэрынарнага і харчовага нагляду Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Васіль Півавар.

**Дзіцячы фонд ААН (ЮНІСЕФ) назваў 2014 год самым разбуральным годам для дзяцей. У гэтым годзе 15 млн дзяцей аказаліся ў цэнтры ўзброеных канфліктаў у Цэнтральнаафрыканскай Рэспубліцы, у Іраку, Паўднёвым Судане, Палесціне, Сірыі і ва Украіне. У цэлым ва ўсім свеце цяпер у краінах або раёнах, закранутых узброенымі канфліктамі, пражываюць прыкладна 230 млн дзяцей.**

Плануецца павялічыць памер дзяржаўнай пошліны за выдачу дазволу на допуск транспартных сродкаў да ўдзелу ў дарожным руху. Арганізацыям, згодна з законапраектам, у наступным годзе трэба будзе плаціць у сярэднім на 2 базавыя велічыні больш. Для ўладальнікаў легкавых аўтамабіляў дзяржпошліну плануецца павысіць у сярэднім на адну базавую велічыню.



# МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

10 снежня 2014 г.
№ 19 (340)


ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

## «ЗАКРЫЙЦЕ ЗВАЛКУ, АБАРАНІЦЕ АД БАРШЧЭЎНІКУ!»

**Жыхары чатырох вёсак Ушацкага раёна патрабуюць закрыць, як яны лічаць, «звалку» і знішчыць баршчэўнік, які падступае літаральна да іх агародаў. Дарэчы, менавіта гэты раён — сумны лідар у Беларусі па агульнай плошчы, дзе расце баршчэўнік. Калектыўны ліст, пад якім падпісаліся каля пяцідзесяці чалавек, быў накіраваны ў райвыканкам і аблвыканкам — на імя кіраўнікоў. Напрыканцы звароту тыя, хто падпісаліся пад ім, папярэдзілі: калі меры не будуць прыняты неадкладна, давядзецца турбаваць вышэйшыя інстанцыі. Наш карэспандэнт разам з супрацоўнікамі Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя сустрэўся з незадаволенымі.**

Людзі супраць «звалкі».



### *Не звалка, а палігон!*

У звароце было адзначана, што *«на адлегласці ўсяго 500 метраў ад вёскі Лутава (практычна ў лесе) знаходзіцца велізарны сметнік… Летам на звалцы ўзнікаюць пажары. Смецце гарыць тыднямі. У бязветранае надвор'е мы літаральна задыхаемся ад едкага дыму! Шматлікія званкі ў пажарныя і экалагічныя службы не прынеслі ніякага выніку…»*

— Гэта не звалка, а адзіны ў раёне палігон цвёрдых бытавых адходаў! У наступным годзе споўніцца роўна 20 гадоў, як па рашэнні райвыканкама было адведзена месца для яго размяшчэння. Зразумела, гэта было зроблена толькі пасля ўзгаднення з усімі зацікаўленымі службамі, напрыклад, санстанцыяй. Палігон функцыянуе, пачынаючы з 1997 года. Ёсць уся неабходная дакументацыя. Падкрэсліваю, што **ён знаходзіцца на прадугледжанай нарматывамі адлегласці ад населеных пунктаў.** Адпаведны «сігнал» з патрабаваннем закрыць палігон быў атрыманы нядаўна, таму мы сустрэнемся сёння з тымі, хто падпісаў калектыўны зварот,— тлумачыць мне **Таццяна ЛАПАТКІНА, намеснік начальніка аддзела аператыўнага кантролю Віцебскага абласнога камітэта прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.**

Палігон не выглядае безгаспадарчым. Калі мы прыехалі, супрацоўнікі сартавалі каштоўныя адходы. Працаваў трактар. Ніякіх гор смецця, парадак паўсюль.

— Усяго на тэрыторыі раёна дзейнічаюць адзін палігон цвёрдых бытавых адходаў і 18 міні-палігонаў. Праўда, у ліпені на палігоне здарыўся пажар. Былі прынятыя меры: на працягу 2 дзён работы па тушэнні завяршылі канчаткова — пасля таго як быў засыпаны ачаг узгарання,— гаворыць **Дзмітрый ШЭСЦЯРЭНЬ, намеснік дырэктара па сацыяльных пытаннях УП ЖКГ Ушацкага раёна.**

— Што датычыцца баршчэўніку, то ва Ушацкім раёне яго сапраўды больш, чым у іншых — расліна займае плошчу ў больш як 443 гектары.

— Сёлета правяралі населеныя пункты Сарочынскага сельсавета — вёскі, у якіх жывуць аўтары звароту, землі ААТ «Дзямянец»… Былі дадзены рэкамендацыі адказным асобам па барацьбе з баршчэўнікам. З-за непрыняцця мер кіраўнік гаспадаркі быў аштрафаваны. Інфармацыйны ліст аб правядзенні мерапрыемстваў па барацьбе з баршчэўнікам быў накіраваны на імя першага намесніка старшыні райвыканкама. Таму нельга гаварыць пра тое, што ніякія меры не прымаліся,— тлумачыць **Іван ПАДГОЛ, кіраўнік Ушацкай раённай інспекцыі прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя.** Так, увесь баршчэўнік мы не знішчылі, але толькі сёлета з раённага бюджэту былі выдзеленыя 133 мільёны рублёў на набыццё ядахімікатаў. Тое пустазелле, пра якое гаворыцца ў звароце, трэба не толькі зрэзаць, не толькі апрацаваць хімікатам глебу. Потым зямлю неабходна ўвесці ў сельскагаспадарчы абарот, інакш баршчэўнік вернецца. Але ж рабіць гэта можна не раней, чым праз 2 гады.

### *«Вось мы і гаруем»*

Сустрэча эколагаў і прадстаўніка камунальнай службы з аўтарамі звароту пачалася з пытанняў апошніх: чаму не прыехалі летам, калі дыхаць было цяжка з-за пажару на палігоне? Чаму агонь пачалі тушыць толькі пасля званкоў у камунальную службу і райвыканкам? Хто наогул даў дазвол на стварэнне «звалкі»?

— Я жыву ў вёсцы Лутава. Калі гарэў палігон, маёй дачцэ было ўсяго некалькі месяцаў. У ліпені была жудасная спёка, а з-за пажару на палігоне на працягу тыдня было немагчыма акно нават адчыніць… На вуліцы з-за смуроду таксама быў жах,— скардзіцца **малады бацька Васіль Шалыга.**

— Мы ж нават не маглі ягады ў лесе збіраць з-за таго смуроду. Пенсія невялікая, дык і прыходзіцца па ягады хадзіць. Заходзіш у лес — дыхаць няма чым,— эмацыянальна кажа пра набалелае **пенсіянерка Надзея Сяргееўна Федарэнка.**

У сваю чаргу людзі пачулі тлумачэнне наконт таго, што на палігоне адразу патушыць агонь немагчыма, бо там, як на тарфяніку, гарыць пластамі: зверху патушылі, а ніжні пласт зноў можа загарэцца…

Той самы баршчэўнік.



Падчас няпростай размовы вяскоўцы агучылі і праблему з вадой. Высветлілася, што летась воданапорная вежа замерзла і людзі засталіся без вады. Па яе хадзілі да калодзежа ў суседні населены пункт. Вада, калі яна ёсць, іржавая, ды і раней такой была… У сельсавеце людзям сказалі: калі ў вёсцы «скінуцца», можна зрабіць калодзеж. Але ў асноўным тут дачнікі жывуць. І толькі ў пяці дварах — мясцовыя.

— Але ж дорага паставіць калодзеж за свой кошт, вось мы і гаруем,— кажа Надзея Сяргееўна.

Дамовіліся ў выніку, што будзе зроблена ўсё магчымае, каб прадухіліць магчымасць узгарання на палігоне. Закрываць яго нелагічна, бо мінімальны тэрмін эксплуатацыі — 30 гадоў. Баршчэўнік, калі надвор'е будзе цёплае, пры ўмове фінансавання будзе знішчацца.

Палігон, дарэчы, ніяк не ўплывае на якасць вады падземных крыніц. Вядома, перабояў з яе падачай не павінна быць. Можа насамрэч калодзеж у вёсцы стаў бы аптымальным вырашэннем праблемы? Напэўна, вяскоўцам трэба яшчэ раз звярнуцца ў сельвыканкам ці райвыканкам, каб у выніку абмеркавання і на ўзроўні мясцовай улады воднае пытанне было «знятае».

**Аляксандр ПУКШАНСКІ. Фота аўтара.**

*Ушацкі раён.*

ПА СЛЯДАХ АДНАГО ЗВАРОТУ

## І МАЛАКАВОЗ ПРЫЙШОЎ

**На «прамую лінію», якую праводзіў старшыня Брэсцкага аблвыканкама Канстанцін Сумар 12 лістапада, дазванілася Любоў Ціханаўна Роля з вёскі Велясніца Пінскага раёна. Жанчына скардзілася на тое, што ў яе не бяруць лішкі малака.**

У сваёй падсобнай гаспадарцы яна трымае 10 кароў, а вось здаць малако няма ніякай магчымасці. Летам праблема часткова вырашалася з дапамогай дачнікаў: недалёка ад вёскі знаходзяцца два дачныя кааператывы. «А восенню і зімой зусім няма куды яго дзяваць, бываюць дні, хоць у равок тое малако вылівай»,— выказвала сваю крыўду вясковая гаспадыня. Губернатар тады паабяцаў паспрыяць у вырашэнні праблемы. Адпаведнае даручэнне атрымаў старшыня Пінскага райвыканкама Валерый Рабкавец.

Аўтар гэтых радкоў вырашыла дазваніцца ў Велясніцу і пацікавіцца, што памянялася з тае пары.

Любоў Ціханаўна пачала з удзячнасці кіраўніку вобласці за ўвагу да яе звароту. Паводле яе слоў, малакавоз спыніўся насупраць яе сядзібы ўжо на наступны дзень.

— А літаральна ж за некалькі дзён да гэтага я атрымала пісьмо з райвыканкама, дзе мне адмовілі ў маёй просьбе… І ў сельвыканкам я звярталася — там мне раілі самастойна адвозіць малако на малочны завод у Пінск, а гэта 25 кіламетраў,— расказвала Любоў Роля.— Раней усё было добра, бо зборам малака ад насельніцтва займаўся сельсавет. Гады тры таму гэту функцыю перадалі гаспадарцы. А наш былы калгас далучылі да іншага, цэнтр якога знаходзіцца за 18 кіламетраў ад Велясніцы. Нарыхтоўшчыкі заязджаюць туды. А на нашу вёску, дзе з малаказдатчыкаў засталася адна я, ніхто не звяртаў увагі.

Усё лета Любоў Ціханаўна выкручвалася, гандлюючы малаком у дачных пасёлках. Але ж гэта нялёгкая праца. Людзі купляюць па літру, два, тры малака. Гэта вымагае шмат дадатковай работы: занесці, разліць, памыць тару. Паўдня аднімае толькі сам працэс продажу малака. А дзесяць кароў дагледзець трэба, падаіць. Таму здаць малако оптам — самы лепшы варыянт для гаспадыні. Любоў Роля прыклала немалыя намаганні, каб стаць удзельніцай тэлефоннага дыялогу з губернатарам. Расказвала, што сорак хвілін набірала патрэбны нумар, але ўсё ж дазванілася. І вельмі здзівілася, калі літаральна на наступны дзень ля яе варот спынілася машына з цыстэрнай.

Аказалася, што пытанне вырашыць не так і складана, тым больш вёска Велясніца знаходзіцца каля дарогі, па якой праходзіць малакавоз.

Любоў Ціханаўна — спрактыкаваная гаспадыня, якая любіць жывёлу. Яна лічыць, што мясцовая ўлада ўсё ж павінна звяртаць большую ўвагу на падсобную гаспадарку. Яна перакана-на: калі б не было праблемы з нарыхтоўкай кармоў, з выпасам жывёлы, то нават 70-гадовыя пенсіянеркі кароў трымалі б.

Любоў Ціханаўну, як прызналася яна, муж ужо не раз угаворваў збыць гаспадарку ці скараціць яе ўтрая. Сам ён інвалід першай групы па зроку, таму істотна дапамагчы жонцы з доглядам кароў не можа. Падтрымліваюць бацьку і гарадскія сыны: не раз заводзілі размову, што маці трэба падумаць пра цалкам заслужаны адпачынак. Ды яна пакуль не згаджаецца.

— Столькі працы ўкладзена ў мой маленькі статак, кожную з каровак ведаю па характары, звычках. Ці паверыце, рука пакуль не паднімаецца завесці іх на бойню,— гаворыць вясковая гаспадыня.— Хоць і разумею, што работа цяжкая, і з кожным годам не будзе лягчэй. Кармы даводзіцца купляць у фермера з Лунінецкага раёна. Праўда, цяпер з гэтым лепш стала і ў сваёй гаспадарцы. Многае набываем на месцы. Пасу ў асноўным на няўдобіцах, месца хапае. Ну а калі са зборам малака і далей усё будзе ісці гладка, патрымаю яшчэ сваю маленькую ферму,— сказала Любоў Ціханаўна.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

УСЁ Ў ПАРАДКУ

## НЕ ГОРШ, ЧЫМ У ГОРАДЗЕ. А МОЖА, І ЛЕПШ!

### *У Бялыніцкім раёне пацыенты могуць заказаць асабістага тэрапеўта, а лекі па рэцэпце атрымаць літаральна на прыёме*

Урач-тэрапеўт Марыя ЗАЙЦАВА *(справа)* і фельчар Святлана КАЗАКОВА.



Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

**Калі вы ўсё яшчэ лічыце, што самае лепшае медыцынскае абсталяванне знаходзіцца ў Мінску ці ў крайнім выпадку — у абласным цэнтры, то памыляецеся. Сёння і вёскам ёсць чым здзівіць. Нездарма ж у рэспубліканскім конкурсе якасці і культуры медабслугоўвання па выніках мінулага года перамагла Нежкаўская ўрачэбная амбулаторыя Бялыніцкага раёна.**

— Яшчэ не кожная магілёўская паліклініка можа пахваліцца такім абсталяваннем, якое ў нас ёсць,— усміхаецца ў адказ на маё пытанне аб перавагах гарадскога медыцынскага абслугоўвання **загадчыца Нежкаўскай амбулаторыі Марыя ЗАЙЦАВА.**— Нават аналіз крыві мы можам зрабіць за 5 хвілін — у нас для гэтага ёсць аўтаматычны аналізатар. Я ўжо не кажу пра сучасны электракардыёграф «Кардыян», іншыя апараты для дыягностыкі, лячэння і фізіяпрацэдур.

Амбулаторыя абслугоўвае 28 населеных пунктаў у радыусе 16 кіламетраў. З 3200 чалавек, якія пражываюць тут, чацвёртая частка — пенсіянеры, за здароўем якіх патрэбен пастаянны кантроль. У кожнага — «букет» хвароб, скача ціск, «барахліць» сэрца. Але на медыцынскае абслугоўванне наракаць не даводзіцца. Акрамя сучаснай амбулаторыі з клініка-дыягнастычнай лабараторыяй, дзённым стацыянарам і нават стаматалагічным кабінетам, насельніцтва абслугоўваюць яшчэ 3 ФАПы. Ад самай аддаленай вёскі да бліжэйшага фельчарскага пункта — 2 кіламетры. А ў медыкаў, што працуюць тут, на ўзбраенні калі не свая машына, то спецыяльна набыты для гэтых мэт за бюджэтныя грошы веласіпед.

Тут жа, на ФАПе, ёсць невялічкі аптэчны пункт, дзе, як сведчыць урач, ёсць усё неабходнае. У крайнім выпадку фельчар заўсёды можа аператыўна звязацца з аптэкай аграгарадка і папоўніць запас.

— Атрымаць медыцынскую кансультацыю ці набыць лекі жыхары могуць нават не выязджаючы з вёскі,— кажа Марыя Зайцава.— У кожным населеным пункце раз на два тыдні працуе так званы перасоўны ФАП. Прыём вядзецца на базе спецыяльна прызначанага для сустрэч з насельніцтвам «сацыяльнага» дома.

Дасягнуць узорнага ўзроўню амбулаторыі дапамагло яшчэ і тое, што размяшчаецца яна на тэрыторыі аграгарадка Вішоў, дзе знаходзіцца вядомы ў вобласці і за яе межамі калгас «Радзіма». Яго кіраўнік Аляксандр Лапацентаў садзейнічае таму, каб насельніцтва прытрымлівалася здаровага ладу жыцця і не хварэла. У яго гаспадарцы нават існуе цэлая сістэма даплат для тых, хто не мае шкодных звычак і займаецца спортам.

— Ён ніколі не адмаўляецца нам дапамагчы,— заўважае **галоўны ўрач Бялыніцкай раённай бальніцы Віктар ПЯНЬКОЎСКІ.**— За кошт гаспадаркі набыты лабараторнае і іншае абсталяванне. А калі даведаўся, што некалькі чалавек не прайшлі флюараграфію, хуценька арганізаваў транспарт, і мы ўсіх аб'ехалі. Цяпер кіраўнік калгаса шукае сродкі, каб набыць для абслугоўвання насельніцтва медыцынскую машыну.

Дарэчы, Бялыніцкі раён вельмі прывабны для маладых спецыялістаў. Віктар Пянькоўскі ганарыцца тым, што Нежкаўскай амбулаторыяй кіруе ўраджэнка гэтых мясцін. «Восем гадоў таму Марыя Зайцава скончыла Гомельскі медінстытут і вярнулася дадому,— адзначае ён.— Вельмі адукаваны ўрач, пацыенты ад яе ў захапленні.

Насуперак сцвярджэнням, што вёска вымірае, Вішоў можна лічыць перспектыўным аграгарадком. Сёлета тут нарадзілася 34 дзіцяці, а за апошнія як мінімум 5 гадоў не было ніводнага выпадку дзіцячай смяротнасці.

Арганізацыі працы ў сістэме аховы здароўя тут таксама можна павучыцца. Нядаўнія хваляванні, якія выклікала ўвядзенне новых правілаў выдачы лекаў у аптэках, Бялыніцкі раён не закранулі.

— У нас выдачу лекаў, на якія патрэбен рэцэпт, ажыццяўляе ўрач,— удакладняе Віктар Пянькоўскі.— Тэрапеўты і фельчары ФАПАаў заключылі дагаворы з аптэкай, і пацыенты ад гэтага толькі ў выйгрышы.

Сярод ноу-хау ў раёне і такая паслуга, як асабісты тэрапеўт. За асобную плату чалавек ці арганізацыя могуць дазволіць сабе быць пад больш пільным медыцынскім наглядам. Паслуга існуе нядаўна, а ўжо заключана каля 20 дагавораў. Раённая медыцынская ўстанова пачынае ўкараняць і страхавую медыцыну. Шэраг прадпрыемстваў ужо гатовы супрацоўнічаць у гэтым напрамку.

Новыя формы арганізацыі дзейнасці, зацікаўленасць раённай улады і дапамога вядучых прадпрыемстваў раёна дапамагаюць павысіць якасць медыцынскага абслугоўвання.

Пасля таго, як бальніца атрымала ліцэнзію на аказанне транспартных паслуг, няма праблем і з дастаўкай тых, хто хоча прайсці абследаванне ў медыцынскіх установах Магілёва і нават Мінска. Пры жаданні транспарт прадастаўляецца нават для турыстычных паслуг!

Больш камфортным стала і знаходжанне ў бальніцы. Тут ёсць палаты кватэрнага тыпу — з кухнямі і гасцінымі. Тыя ж кухні абсталяваны па-сучаснаму: ёсць халадзільнікі і нават мікрахвалёўкі.

У бліжэйшых планах — адкрыццё сялянога пакоя. Калі медыцына такімі тэмпамі будзе развівацца ў раёнах і далей, неўзабаве гарадскі жыхар пачне зайздросціць вясковаму.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.**

НА СВАІМ МЕСЦЫ

## «МНЕ ПАДАБАЕЦЦА ДАПАМАГАЦЬ ЛЮДЗЯМ»,—

### *гаворыць лепшы ўчастковы Магілёўскай вобласці Сяргей Юханаў*

Нэлі ЗІГУЛЯ

**Нядаўна савет грамадскага пункта аховы правапарадку № 11 Кастрычніцкага раёна г. Магілёва, дзе працуе старшым участковым Сяргей Юханаў, быў прызнаны пераможцам агляду-конкурсу «Лепшы СГПАП вобласці». А сам Юханаў атрымаў «званне» лепшага ўчастковага вобласці.**

Змагацца з парушальнікамі грамадскага парадку цяжка, але, як сведчыць мой суразмоўца, ён мэтанакіравана прыйшоў у гэтую прафесію і мяняць яе не збіраецца. Хаця падстаў для расчаравання хапала. Мікразона, дзе ён працуе, насамрэч зусім не «мікра», бо ўражвае памерамі. Тут жыве амаль 37 тысяч жыхароў як у не самым маленькім райцэнтры. І сачыць за парадкам складана. «Гэта на вёсцы ўсе адзін аднаго ведаюць, а гарадскія жыхары вельмі закрытыя,— уздыхае старшы ўчастковы інспектар.— Калі працаваў у прыватным сектары, было прасцей. Мясцовыя маглі расказаць пра любога чалавека ўсё. А ў шматпавярховіках нікому ні да каго няма справы — тут нават сваіх суседзяў могуць не ведаць».

Кантынгент, з якім прыходзіцца працаваць, вельмі далёкі ад узорнага — выпівохі, дармаеды, скандалісты. Бывае і злачынцаў прыходзіцца затрымліваць. «Аднойчы ездзілі на начныя скандалы, а ў перапынках паміж званкамі сачылі за парадкам у горадзе,— успамінае Сяргей Юханаў.— Бачым, з крамы выйшаў хлопец нападпітку і неяк падазрона сябе паводзіць. То ў адзін бок пойдзе, то ў другі. І тут насустрач яму жанчына. Ён падбягае да яе, вырывае сумачку — і наўцёкі. Але далёка не паспеў адбегчы, мы яго хутка затрымалі».

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

ТЭМА ДНЯ

## ЗНЕСЦІ НЕЛЬГА ВЫКАРЫСТАЦЬ



Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ

**Удасканаленне дзейнасці Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню, а таксама забеспячэнне ўстойлівага сацыяльна-эканамічнага развіцця вёскі абмеркавалі ўдзельнікі «круглага стала». Мерапрыемства прайшло ў Інстытуце дзяржаўнай службы Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь. У ім прынялі ўдзел старшыні пасялковых і сельскіх Саветаў дэпутатаў, а таксама госці з Таджыкістана, якія прыехалі ў Беларусь для павышэння кваліфікацыі.**

Замежным гасцям цікава было пачуць аб рабоце беларускага парламента і, у прыватнасці, Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, якую ўзначальвае **Святлана ГЕРАСІМОВІЧ**, а таксама Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання. «Сярод актуальных пытанняў, якімі займаюцца дэпутаты, — стварэнне ўмоў для прадпрымальніцкай дзейнасці, турысцка-экскурсійных паслуг, аграэкатурызму, нармальнай жыццядзейнасці людзей, забеспячэнне тэрыторый якаснай пітной вадой. Вялікая ўвага надаецца навядзенню парадку на зямлі, добраўпарадкаванню населеных пунктаў»,— адзначыла сенатар.

Пра тое, як рэалізуюцца палажэнні Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 100 «Аб мерах па ўдасканаленні ўліку і скарачэнні колькасці пустуючых і старых дамоў у сельскай мясцовасці», расказала **начальнік аддзела Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Вікторыя ВЕРЫНА.** На напрацоўках цэнтральнага рэгіёна ў гэтым напрамку спыніўся **старшыня Мінскага абласнога Савета дэпутатаў Іван ЛІПНІЦКІ.**

### *Дзе справядлівасць?*

У Мінскай вобласці летась знесена 1260 старых і пустуючых дамоў. На гэты год запланавана 1360. «Але іх размеркаванне па канкрэтных рэгіёнах вельмі адрозніваецца,— заўважыў Іван Ліпніцкі.— Бярэзінскі і Клецкі раёны бяруць на сябе амаль паўтысячы старых будынкаў, чаго не скажаш пра Мінскі раён. І гэтаму ёсць тлумачэнне — зямля тут каштуе дорага, спадчыннікам не надта хочацца развітвацца з ёю. Пры гэтым, калі браць Дзяржынскі, Валожынскі, Пухавіцкі, Уздзенскі раёны, то найбольшая запатрабаванасць зямельных участкаў менавіта ў тых сельсаветах, якія прылягаюць да Мінскага раёна. «Таму мы вымушаны часам прымяняць і адміністрацыйныя метады, калі бачым, што раёны нераўнамерна бяруць на сябе нагрузку па зносе. Напрыклад, дзе справядлівасць: Клецкі раён павінен знесці 300 дамоў, а Мядзельскі толькі 25–30? Хаця і тут зямля «гуляе» пад пустуючымі дамамі, няма гаспадароў»,— заўважыў старшыня аблсавета.

**У 2013 годзе ў Капыльскім раёне быў знесены стары дом, які, так бы мовіць, дыхаў на ладан. Пасля гэтага аб'явілася спадчынніца, якая пражывала ў Расіі, і запатрабавала кампенсацыю.**

З гэтай нагоды ён нагадаў пра вельмі красамоўны выпадак. У 2013 годзе ў Капыльскім раёне быў знесены стары дом, які, так бы мовіць, дыхаў на ладан. Пасля гэтага аб'явілася спадчынніца, якая пражывала ў Расіі, і запатрабавала кампенсацыю. Дайшла да гаспадарчага суда, які задаволіў яе патрабаванні — выплаціць 40 млн рублёў. Довады, што жанчына на працягу гадоў не плаціла падатак на зямлю і нерухомасць, не былі прыняты да ўвагі.

У сувязі з гэтым, лічыць Іван Ліпніцкі, наспела неабходнасць унесці прапанову ў Савет па ўзаемадзеянні па зменах і дапаўненнях у заканадаўчую базу. У прыватнасці, згодна з Указам Прэзідэнта № 100, пустуючыя дамы — гэта тыя, пра якія ёсць **дакладныя звесткі**, што на працягу трох апошніх гадоў асобы, якія маюць права карыстання імі, пражываюць у іх менш за адзін месяц. Але ў законе не прапісана, якія ж дакументы могуць з'яўляцца верагоднымі сведчаннямі пра гэта. А такія палажэнні, на думку старшыні абласнога Савета, павінны змяшчацца ў адпаведных дакументах.

Па-другое, у раённыя камісіі, якія ацэньваюць стан пустуючых дамоў, не ўваходзіць пракурор. «А без яго санкцыі мы не можам ускрыць будынак»,— канстатаваў Іван Ліпніцкі. На яго думку, неабходна на заканадаўчым узроўні ўстанавіць норму **пазасудовага адчужэння** пустуючых зямельных участкаў і збудаванняў на падставе прадстаўлення сельвыканкама, заключэння раённай камісіі і рашэння райвыканкама. Гэта будзе дысцыплінаваць насельніцтва. **Калі грамадзянін ці спадчыннік па завяшчанні ці па законе не аформіў або не падаў заяву ў натарыяльную кантору аб уступленні ў права спадчыннасці ў вызначаныя заканадаўствам тэрміны, не даглядае дом, не апрацоўвае зямельны ўчастак, то такі дом павінен аўтаматычна пераходзіць у дзяржаўную ўласнасць.** Пры гэтым, як адзначыў Іван Ліпніцкі, нельга парушаць правы грамадзян, калі яны знаходзяцца на ваеннай службе, у працяглай камандзіроўцы, на лячэнні. Пустуючыя дамы можна аддаць тым, хто мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў. А калі такіх няма — выставіць на аўкцыён.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)*

**ТАЛАКОЙ!**

# ВЯРТАННЕ ДА ЗАБЫТЫХ ІСЦІН

***На Гродзеншчыне ўжо склалася традыцыя: штогод у розных раёнах праводзяцца абласныя сходы, дзе пытанні правапарадку сумесна абмяркоўваюць работнікі міліцыі, уладных структур і прадстаўнікі грамадскіх фарміраванняў.***

**Чарговая сустрэча прадстаўнікоў самых розных прафесій адбылася на Навагрудчыне. Прычым, сустрэліся ў пэўным сэнсе калегі, каб не толькі азнаёміцца з цікавым вопытам, узнагародзіць лепшых участковых інспектараў, добраахвотных дружыннікаў (іх на Гродзеншчыне больш за 4 тысячы), старастаў і іншых грамадскіх актывістаў, але і засяродзіць увагу на існуючых праблемах, якія можна вырашыць толькі разам, талакой, як спрадвеку рабілася на нашых землях.**

Усе выказаныя заўвагі і прапановы (у прыватнасці, па матэрыяльным аснашчэнні грамадскіх пунктаў аховы правапарадку, забеспячэнні ўчастковых інспектараў міліцыі жыллём) **старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір КРАЎЦОЎ** даручыў аформіць пратакольна — з далейшым кантролем за вырашэннем тых ці іншых пытанняў.

## ВЫХАВАННЕ ПРАЦОЎНАЕ...

**Старшыня Нягневіцкага сельскага Савета Васіль РУДАКОЎСКІ** ўзначальвае і савет грамадскага пункта аховы правапарадку. На пасяджэнні збіраюцца раз на месяц, але працуюць практычна штодзень: у кантакце са школай, добраахвотнай дружынай, якой кіруе **начальнік вартавой аховы сельгаспрадпрыемства Уладзімір УРБАН,** і яго сынам, **участковым інспектарам міліцыі Максімам УРБАНАМ.** Для дружыннікаў, дарэчы, нядаўна пашылі спецыяльную форму (кошт камплекта — 470 тысяч рублёў), у якой яны будуць выходзіць на дзяжурствы.

На тэрыторыі сельсавета цяпер пражывае 5, так бы мовіць, сацыяльна небяспечных сем'яў, да якіх асаблівая ўвага з боку ўладных і грамадскіх фарміраванняў. І не без поспеху — ужо ёсць рэальная надзея, што ў дзвюх сем'ях бацькі становяцца на шлях выпраўлення. Пры гэтым найлепшым сродкам для перавыхавання тых, хто злоўжывае алкаголем (а такіх у населеных пунктах сельсавета каля 40 чалавек) Васіль Рудакоўскі лічыць уцягненне іх у работу. Але якім чынам, калі такім людзям не давяраюць пастаянную працу ў тым жа сельгаскааператыве, бо пасля атрымання зарплаты іх можна некалькі дзён не ўбачыць на рабочым месцы?

— Тым не менш каля дзесяці чалавек мы сёлета здолелі загрузіць работай. Па дагаворы падраду яны працавалі на добраўпарадкаванні населеных пунктаў — на выкошванні пустазелля, абрэзцы дрэў, навядзенні парадку на могілках, разборцы кінутых дамоў, якіх на нашай тэрыторыі каля двухсот, — кажа Васіль Рудакоўскі.

Дзве газонакасілкі ў распараджэнне сельсавета прадаставіў райвыканкам, яшчэ адну — сельгаскааператыў, а прыватны прадпрымальнік купіў бензапілу. Дапамагае і раённы цэнтр занятасці насельніцтва — не толькі фінансава, але і навучаннем людзей патрабаванням бяспекі пры абыходжанні з тэхнікай.

Не гарантыя, вядома, што такая «працатэрапія» станоўча паўплывае літаральна на ўсіх. Аднак відавочныя і плюсы. Хаця б у тым, што калі гэтых людзей не задзейнічаць у рабоце, то ад іх у вёсках будуць толькі праблемы. А так, пад наглядам старшыні сельвыканкама, яны і населеным пунктам карысць прыносяць, і грошы маюць заробленыя, а не атрыманыя незаконным спосабам.

## ...І ДУХОЎНАЕ

Пасля знаёмства з арганізацыяй работы грамадскіх актывістаў па ахове правапарадку ўдзельнікі абласнога сходу пабывалі ў Свята-Елісееўскім Лаўрышаўскім мужчынскім манастыры, які знаходзіцца на тэрыторыі гэтага сельсавета.

— Усе мы выконваем прыкладна аднолькавую місію — перамагаць зло на гэтай зямлі. Толькі ў розных формах: у нас яна больш духоўная, у вас — больш матэрыяльная, — сказаў **ігумен манастыра айцец ЯЎСЕВІЙ,** сустракаючы ўчастковых інспектараў міліцыі.

Адзін з самых старажытных манастыроў на беларускіх землях цяпер актыўна адраджаецца, імкнучыся годна выконваць сваю галоўную місію сацыяльнага служэння — дапамогі хворым, а таксама тым, хто трапіў у залежнасць ад алкаголю, наркотыкаў, — вяртаючы іх, так бы мовіць, да забытых ісцін.

— Мы спрабуем дапамагчы людзям, якія страцілі сябе ў жыцці, адчаяліся. І першая ўмова для іх рэабілітацыі тут — гэта поўнае паслушэнства, інакш дапамагчы чалавеку будзе вельмі цяжка. Таму, калі ён сюды прыехаў, то павінен выканаць нашы патрабаванні, — тлумачыць айцец Яўсевій. — Першае — наведванне штодзённа набажэнстваў у храме (яны даволі працяглыя — раніцай і вечарам па тры гадзіны). І другое — рэабілітацыя з дапамогай працы. Ніхто ў гультайстве знаходзіцца не можа. Даецца канкрэтны працоўны паслух, і ты мусіш яго выконваць. Сюды прыязджаюць такія людзі — выгляду ніякага няма. Адмываем, апранаем, адкормліваем — праз тыдзень у чалавека пачынаюць свяціцца вочы. А праз два ён ператвараецца ў нармальнага чалавека. Калі людзі зацікаўлены сабе дапамагчы, то мы проста іх да гэтага падштурхоўваем. Задаюць пытанні і духоўнага плана, і нават філасофскага — спрабуем дапамагчы чалавеку разабрацца, што з ім адбылося, што паслужыла прычынай маральнага падзення. І калі ён хоча вярнуцца ў рэчышча нармальнага чалавечага жыцця, то даволі хутка «становіцца на ногі».

У манастыры ўжо дапамаглі вельмі многім, сведчыць айцец Яўсевій. Напрыклад, прыязджалі хлопец і дзяўчына з вельмі сур'ёзнымі праблемамі. І ў псіхолагаў былі, і лячыліся, і «падшываліся» ад шкодных залежнасцяў — нічога не дапамагала. Цяпер жа яны стварылі сям'ю, цудоўна жывуць, працуюць.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

*Навагрудскі раён.*

### *У тэму*

***На сходзе адзначалася, што рашэнне аб забароне рэалізацыі спіртных напояў у начны час, прынятае Гродзенскім аблвыканкамам у сакавіку сёлетняга года па ініцыятыве праваахоўных органаў, дазволіла скараціць ужыванне алкаголю і маштабы «п'янай» злачыннасці. Праўда, узгадніць падыход з рознымі ведамствамі ўдалося не адразу, былі думкі, што арганізатары абмежавальных захадаў перавышаюць свае паўнамоцтвы. Таму, паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення прафілактыкі МУС Беларусі Алег КАРАЗЕЙ, ужо ўзгоднены з усімі дзяржаўнымі органамі і ўнесены ў парламент праект закона, якім прадугледжваецца вызначэнне па ўсёй краіне адзінага часу гандлю спіртным.***

# «МНЕ ПАДАБАЕЦЦА ДАПАМАГАЦЬ...»

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

Сумаваць без справы не прыходзіцца. За суткі здараецца па 10–15 сямейных скандалаў. Некаторыя ў роспачы тэлефануюць непасрэдна на мабільны: ратуйце, муж п'яны прыйшоў, з дзецьмі на вуліцу з дома выгнаў. Вядома, калі дом недалёка, можна і самому бегчы на дапамогу. Але калі на дарогу спатрэбіцца паўгадзіны, сігнал перадаецца бліжэйшаму нараду. Скандаліста прывозяць у апорны пункт, складаюць пратакол. Калі чалавек не разумее, што ён павінен жыць у згодзе з іншымі — атрымлівае запрашэнне на пасяджэнне савета грамадскага пункта аховы правапарадку, дзе яго паводзіны разглядаюць.

«Мы, вядома, і па працоўных калектывах ходзім, і з сем'ямі сустракаемся — размаўляем, тлумачым, — кажа Сяргей Юханаў. — Але на ўліку знаходзіцца шмат катэгорый правапарушальнікаў, з якімі трэба працаваць пастаянна. Толькі судзімых, якія на асаблівым кантролі, 12 катэгорый».

Галаўны боль участковых — п'яніцы і дэбашыры. Ад п'янага чалавека можна чакаць чаго заўгодна. Былі выпадкі, калі нават на міліцыянераў кідаліся. «Але прымяняць зброю, на шчасце, не прыходзілася, — прызнаецца Сяргей Уладзіміравіч. — Хаця некаторыя паводзяць сябе вельмі агрэсіўна. У такім стане чалавек сабой не кіруе. Вось калі праспіцца, яго наогул не пазнаць. Сама ветлівасць. Нават і не памятае, што вечарам рабіў».

Калі выпадкі паўтараюцца і ніякія іншыя метады не дапамагаюць, прыходзіцца ізаляваць грамадзяніна. Нехта, як толькі яго ставяць на ўлік у наркадыспансер, адразу мяняецца. Можа нават адмовіцца ад спіртнога. Некаторыя пачынаюць хавацца, адседжваюцца ў такіх жа, як самі, аматараў гарэлкі або ў сваякоў. Каму ж хочацца ў ЛПП? Міліцыя іх шукае, пакуль нехта з суседзяў не вытрымае і не заявіць.

Зразумела, ЛПП таксама не панацэя. Нават тыя, хто вярнуўся адтуль, працягваюць злоўжываць спіртным. Але ў гэтым выпадку нават часовая адсутнасць мужа і бацькі-алкаголіка — усё ж адпачынак для сям'і.



Фота Нэлі ЗІГУЛІ.

Лепшы СГПАП Магілёўскай вобласці: мы — адна каманда!

Хаця паскандаліць могуць і цвярозыя грамадзяне. Неяк патэлефанавала жанчына: гвалт, ратуйце! А калі ўчастковы прыйшоў, пачала скардзіцца на мужа, што ён... ключы ад машыны не дае. «У такім выпадку можам і пратакол скласці за беспадстаўны выклік, — кажа ўчастковы. — Трэба ж неяк вучыць насельніцтва».

Цяжэй уздзейнічаць на выпівох, у якіх, напрыклад, дыягнаставаны некаторыя формы туберкулёзу або іншыя захворванні. Ім ЛПП наогул супрацьпаказаны. Такіх застаецца толькі трымаць на кантролі і імкнуцца дастукацца да сумлення.

— У мяне на ўчастку ёсць сям'я, дзе і бацькі, і іх 30-гадовы сын хворыя, але п'юць непрабудна, — расказвае ўчастковы. — Пакуль сын на заробках у Расіі — ціха; як толькі вяртаецца — увесь дом стаіць на вушах.

...Пакуль па дапамогу да ўчастковага ніхто не звярнуўся, ідзём «па адрасах». Каля пад'езда на вочы трапляюць двое мужчын непрэзентабельнага выгляду, такіх звычайна можна сустрэць непадалёку ад вінагарэлачных магазінаў. Ад сустрэчы з міліцыянерам настрой у іх прыкметна псуецца. «Алег Аляксандравіч, а чаму вы не на рабоце?» — пытаецца ў аднаго з іх участковы. Той пачынае казаць пра тое, што пашкодзіў руку, адпрасіўся, каб наведаць паліклініку. Відавочна хлусіць: ну хто па паліклініках з «таварышамі» ходзіць, ды яшчэ з пакетам пустых бутэлек?

Участковы просіць паказаць кватэру. Падымаемся наверх, замест ключа гаспадар дастае... адвёртку і, пакорпаўшыся ў дзвярах, нарэшце іх адчыняе. У нос шыбае жудаснае «амбрэ». Трохпакаёўка нагадвае поле бітвы...

— Чаму такі беспарадак? — пытаецца ўчастковы. Грамадзянін у адказ пачынае казаць нешта пра рамонт, скардзіцца на невялікі заробак, якога ледзь хапае на ежу. Цісне на шкадаванне.

Ужо на вуліцы Сяргей Юханаў тлумачыць, што мужчына 3 гады стаіць на ўліку як абавязаны выдаткоўваць дзяржаве грошы на выхаванне двух дзяцей. Працуе ў адным з ЖЭУ, але злоўжывае спіртным. «Пасля Новага года зоймемся яго афармленнем у ЛПП», — кажа міліцыянер.



Спрабуем зайсці яшчэ да адных «кліентаў», але за дзвярамі — цішыня. Сяргей Юханаў мяркуе, што выпівохі альбо пайшлі па чарговую бутэльку, альбо адсыпаюцца. Гэта тая самая сям'я, у якой ёсць супрацьпаказанні для размяшчэння ў ЛПП.

— А аглядныя камісіі дапамагаюць неяк змагацца з асацыяламі? — пытаюся ў суразмоўцы.



Сяргей Юханаў прызнаны ў сваёй прафесіі лепшым.

— Тут ўсе спосабы добрыя. І грамадскія аглядальныя камісіі таксама. У іх адразу шэраг спецыялістаў уваходзіць — прадстаўнік з райвыканкама, настаўнік, ратавальнік, інспектар па справах непаўналетніх, участковы... Наведваем сем'і, дзе выхоўваюцца дзеці, а таксама пенсіянераў, інвалідаў, аматараў выпіць. Знаёмімся з умовамі пражывання, утрымання непаўналетніх. Адны ставяцца да гэтага з паразуменнем, іншыя вядуць сябе агрэсіўна. Пачынаюць папракаць: чаму ходзіце, чаму ўсюды заглядваеце. Маўляў, не маеце права. Звычайна незадаволены тыя, хто прывык жыць за кошт дзяржавы. Ім за даўгі адключаюць электраэнергію, ваду. Тое, што сваімі паводзінамі яны ствараюць пагрозу для грамадства, ім і справы няма. Але калі імі не займацца, будзе толькі горш.

# ЗНЕСЦІ НЕЛЬГА ВЫКАРЫСТАЦЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)***

### *Лепш дамовіцца*

— Так, жыццё не стаіць на месцы, і ў законы таксама трэба ўносіць змены. Але ў любым законапраекце ўсё дакладна не ўлічыш. Старшыні сельскіх Саветаў павінны быць знаёмы з кожнай сям'ёй, з кожным жыхаром. Тыя, хто працаваў да вас, ведаюць, каму належаў дом, на якім этапе ён перастаў абслугоўвацца. Калі памірае стары чалавек, трэба адразу ж варушыцца, высвятляць, шчыльна займацца гэтымі пытаннямі. Тады намнога лягчэй будзе выконваць законы, якія прымаюцца, і не спатрэбяцца суды, — параіла Святлана Герасімовіч.

— Калі да нас прызначылі новага старшыню райвыканкама, ён запрасіў да сябе ўсіх старшынь сельскіх Саветаў і сказаў літаральна наступнае: вы мае памочнікі, мая апора. Вы і псіхолагі, і дыпламаты, і вам вырашаць пытанні, якімі не павінен займацца чыноўнік. У гэтым плане, лічу, мы ў больш выгадным становішчы ў параўнанні з іншымі раёнамі, бо адчуваем падтрымку і разуменне мясцовай улады, у тым ліку і па пытаннях выкарыстання пустуючых дамоў, — канстатавала **старшыня Салігорскага раённага Савета дэпутатаў Лідзія КЛІШЭВІЧ.** — Разам з тым і нам не ўдалося пазбегнуць непрыемнай сітуацыі. У адным з сельсаветаў быў знесены стары дом. Пры гэтым прысутнічала і адна з уласніц, нават дапамагала выносіць рэчы. Але затым жанчына перадумала і... падала іск у суд разам са сваёй сваячкай. І ім вымушаны былі выплаціць кампенсацыю: па 28 млн рублёў кожнай.

Сёння мы імкнёмся вырашаць пытанні не праз суды, а непасрэдна са спадчыннікамі: знаходзім іх, прымаем ад іх адмоўніцкія пісьмы і з іх згоды зносім старыя дамы. Акрамя таго, за кожным сельсаветам распараджэннем старшыні райвыканкама замацаваны арганізацыі, у тым ліку і гарадскія, якім ставяцца дакладныя задачы: у пэўны тэрмін у канкрэтным населеным пункце знесці дом.

### *Па адзіным стандарце*

Спынілася Лідзія Клішэвіч і на такім пытанні, як навядзенне парадку на грамадскіх могілках. Усяго ў раёне іх 103, у тым ліку 14 з іх перададзены на баланс ЖКГ, астатнія ў веданні сельскіх Саветаў. Неагароджанымі засталося толькі 10 могілак. «Мы мэтанакіравана ідзём да таго, каб агароджа была не драўляная, а бетонная. Стараемся, каб парадак на магілах наводзілі самі людзі, блізкія, родныя. І толькі там дзе няма сваякоў, падключаем грамадскасць, — адзначыла Лідзія Клішэвіч. — Нашы дэпутаты пастаянна даводзяць да сваіх выбаршчыкаў, што яны самі павінны падтрымліваць парадак там, дзе жывуць: на сваёй тэрыторыі, у доме, пад'ездзе. Нам не патрэбны пратаколы, спагнанні. Нам патрэбен парадак, якога можна дасягнуць толькі ўзаемаразуменнем».

— Створана рабочая група па ўдасканаленні работы ЖКГ, якая вывучае ў тым ліку і пытанні добраўпарадкавання населеных пунктаў, навядзення парадку на зямлі, — паведаміў **намеснік міністра жыллёва-камунальнай гаспадаркі Анатоль ШАГУН.**

У прыватнасці, яна прапануе дазволіць органам мясцовай улады замацоўваць асобныя тэрыторыі за суб'ектамі гаспадарання і грамадзянамі для выканання работ па іх утрыманні. Прадугледжваецца, што асвятленне вуліц у населеных пунктах будзе перададзена энергазабяспечвальным арганізацыям. Але фінансаванне застанецца з мясцовага бюджэту. Па-другое, вуліцы сельскіх населеных пунктаў мэтазгодна перадаць на абслугоўванне дарожным арганізацыям мясцовых ЖКГ — каб забяспечыць адзіны стандарт іх утрымання.

**ЖЫЦЬ ПРЫГОЖА**

# ІНІЦЫЯТЫВА ВІТАЕЦЦА

## І ПАДТРЫМЛІВАЕЦЦА ФІНАНСАМІ

***Ажно 36 ідэй, прапанаваных жыхарамі Рагачоўскага раёна, знаходзяць сваё ўвасабленне дзякуючы грантам Еўрапейскага саюза. Ірына Седлер, кіраўнік праекта «Стварэнне эфектыўнай сістэмы культурных і інфармацыйных паслуг для сельскага насельніцтва «Свет інфармацыі, культуры і творчасці — для ўсіх», расказвае, што мясцовыя ініцыятывы былі падтрыманы грантам на максімальную суму — 250 000 еўра.***



Дырэктар Збароўскага Дома культуры і «гаспадыня» экамузея Антаніна Варанцова.

— Рэалізацыя праекта пачалася з ліпеня мінулага года, — расказвае Ірына Рэнальдаўна. — За год мы шмат чаго паспелі зрабіць. Спачатку вывучалі грамадскую думку па праблемах сельскіх жыхароў, у тым ліку ў сферы культурных паслуг. У нас на Рагачоўшчыне каля 200 вёсак, і толькі ў 36 ёсць установы культуры. Таму набылі аўтобус і апаратуру для перасоўнага клуба. Такі клуб на колах выязжае ў аддаленыя вёскі з канцэртамі. Цяпер у нас у тры разы вырасла колькасць выездаў — у тым ліку ў населеныя пункты, пацярпелыя пасля аварыі на Чарнобыльскай АЭС.

У аграгарадку Лучын — самая вялікая суполка актыўных жыхароў. Ад іх населенага пункта паступіла ажно чатыры ініцыятывы. Дзве з іх звязаны з публікацыямі творчых і даследчых работ мясцовых краязнаўцаў. Чытачы «Звязды» добра ведаюць Соф'ю Кусянкову. Яна ў межах праекта ЕС цяпер рыхтуе выданне сваіх нарысаў-замалёвак асобнай кніжкай. Мясцовы гісторык і краязнаўца Святлана Варыкава займаецца вывучэннем легендаў пра валуны. Яе доследную працу арганізатары таксама палічылі вартай друкавання ў межах праекта. Дарэчы, яшчэ адзін аўтар жыве ў іншай вёсцы — Хатоўня. Член Саюза пісьменнікаў, былы настаўнік гісторыі Віктар Купрыянчук рыхтуе да публікацыі цыкл апавяданняў пра вёску.

— Сёння мы вельмі актыўна займаемся падрыхтоўкай да выдання кніг гэтых трох аўтараў, — адзначае Ірына Седлер. — Іх работы ацэнены нашай экспертнай камісіяй. Цяпер удакладняем форму, аб'ёмы і нейкія іншыя параметры, каб падрыхтаваць канкурэнтную прапанову на тэндар.

А яшчэ жыхары Лучына даўно марылі пра аднаўленне колішняга свята «Грай, гармонік». Сваё жаданне яны афармілі ў выглядзе ініцыятывы ў межах праграмы Еўрапейскага саюза «Недзяржаўныя структуры і мясцовыя органы ўлады ў дзейнасці па развіцці 2011–2012». Такім чынам адрадзілася забытае свята, якое, мараць арганізатары, абавязкова будзе праводзіцца штогод.

Сёлета ў Лучын з'ехаліся ўсе лепшыя хлопцы з дванаццаці вёсак Рагачоўскага раёна — з мілымі сэрцу кожнай жанчыны гармонікамі. Не саступалі ім прыпевачніцы. Самым юным удзельнікам было па 10–12 гадоў, самай дасведчанай — Надзеі Адамаўне Швед — 88. Яна, дарэчы, заняла першае месца ў намінацыі «лепшая прыпевачніца». Пры гэтым жанчына прадэманстравала зайздросны аптымізм, жыццялюбства і майстэрства. Лепшымі гарманістамі журы прызнала Віктара Чабатара з Лучына, Аляксандра Цырыкава з Азяран і юнага Уладзіслава Селіверстава з Забалацця.

Ёсць у вёсцы Лучын дзіцячае аматарскае аб'яднанне — клуб выхаднога дня «Нядзелька». Пад кіраўніцтвам дырэктара дома культуры Надзеі Борыкавай і мастацкага кіраўніка Інэсы Правалоцкай дзеці розных узростаў бавяць свой вольны час вельмі разнастайна. Напрыклад, выязджаюць на экскурсіі. Наведалі лядовы палац, аквапарк у Жлобіне, тэатры, цырк у Гомелі, басейн у вёсцы Ціхінічы, этнаграфічную вёску пад Магілёвам... Праводзяць шмат розных спартыўных спаборніцтваў па тэнісе, лыжах, дартсе... Для дзяцей, таксама на грошы ЕС, у бліжэйшай перспектыве плануецца набыць спартыўны рыштунак і касцюмы.

— Яшчэ мы папулярызуем Стрэнькаўскі цэнтр рамёстваў, — расказвае Ірына Седлер. Для яго была набыта камп'ютарная тэхніка. Там створаны музей традыцыйнай беларускай лялькі, які сёння вельмі паспяхова развіваецца. Іх вырабы запатрабаваны і ў Гомелі, і ў Мінску. Да апошняга часу ім не хапала тэхнічных магчымасцяў, каб вырабляць буклеты, візітоўкі, надпісы на ляльках... Таму яны выйшлі з ініцыятывай аб набыцці камп'ютара і каляровага прынтара. Цяпер у межах той жа праграмы атрымалі неабходную тэхніку і робяць усё самастойна.

Тым часам у вёсцы Збароў на Рагачоўшчыне створаны экамузей зёлак. Раённы аддзел культуры толькі прадаставіў памяшканне, а за кошт сродкаў праекта былі цалкам зроблены рамонт, афармленне, набыта абсталяванне і мэбля. Сёння наведвальнікамі музея часта становяцца шматлікія пацыенты санаторыя «Дняпроўскія сосны», што знаходзіцца недалёка. Дырэктар Дома культуры Антаніна Варанцова, медсястра па адукацыі, з інтарэсам і задавальненнем займаецца гэтым разам з мясцовымі жыхарамі, якія збіраюць зёлкі. За лета назапасілі вельмі багата лекавых раслін. Сакрэтаў не робяць і дзеляцца з наведвальнікамі тэхналогіямі нарыхтоўкі, перапрацоўкі, захавання і выкарыстоўвання лячэбнай сыравіны. Для іх у межах праекта была заказана спецыяльная сувенірная прадукцыя.




Сустрэча з жыхарамі невялічкай вёскі Асіннікі Забалацкага сельсавета.

— Правядзенне фестывалю мёду ў вёсцы Забалаць, на чыстай ад радыяцыі тэрыторыі, таксама ініцыятыва зацікаўленых мясцовых жыхароў, — працягвае Ірына Седлер. — На Рагачоўшчыне вельмі развітае бортніцтва, таму гэта зручная пляцоўка для правядзення фестывалю «Смак мёду». За кошт гранта Еўрасаюза былі набыты гукавая апаратура і ўсё выставачнае абсталяванне. Фестываль, спадзяюся, стане штогадовым, і кожны год колькасць яго ўдзельнікаў будзе расці.

Усяго за кошт сродкаў праграмы Еўрасаюза для ўвасаблення ініцыятыў жыхароў Рагачоўшчыны былі набыты 22 камплекты рознай апаратуры. Дарэчы, у раёне ёсць чатыры аматарскія калектывы, якія маюць званні народных. На наступны год запланавана набыць для іх удзельнікаў новыя касцюмы.

— Усё гэта робіцца для таго, каб падняць настрой вясковых жыхароў, каб яны радаваліся, а іх творчыя пачынанні ўвасабляліся ў жыццё, — дзеліцца Ірына Седлер. — Важна, каб усе ініцыятывы людзей сталі ўстойлівымі і развіваліся нават пасля завяршэння праекта. У мяне ёсць мара — каб у кожным сельскім Савеце было сваё свята, куды б прыязджалі адусюль людзі. Такія цікавыя, характэрныя толькі для гэтай мясцовасці мерапрыемствы могуць стаць брэндам тэрыторыі. Дарэчы, і старшыня райсавета Валянціна Ганковіч вельмі зацікаўленая ідэяй брэндынгу. Яна актыўна спрыяе таму, каб сельскія Саветы падтрымлівалі ініцыятывы людзей, каб кожная тэрыторыя мела сваю «іскрынку».

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

**РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.**

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

**Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»**

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 20.010.** **Нумар падпісаны ў 19.30 9 снежня 2014 года.**

■ Фінансавы выдатнік

# НАМ НЕ СТРАШНЫ ШЭРЫ... ФІШЭР

## У 95% выпадкаў ад махлярства ратуе элементарная асцярожнасць

**Безнаяўныя плацяжы ўсё часцей грукаюць у нашы дзверы. Аднак, далёка не ўсе ў нас выкарыстоўваюць магчымасці банкаўскай карткі па максімуме. Сёння мы працягваем цыкл матэрыялаў аб безнаяўных разліках. Дапамагае нам вядомы эксперт па гэтай тэме — дырэктар нацыянальнай плацежнай сістэмы «БелКарт» Аляксандр СОТНІКАЎ.**



### ЛЕПШ КРЭДЫТНАЯ КАРТКА АБО АВЕРДРАФТ?

У любога чалавека часцяком узнікае патрэба пазычыць тую ці іншую суму. У гэтым выпадку мой калега бегае па суседзях. Гэта ратуе — калі яны заўсёды з грашыма. А вось каб не залежаць ад падобных фактараў, можна аформіць крэдытную картку. Яе галоўная перавага ў тым, што вы плаціце працэнты толькі на існуючую запазычанасць.

Напрыклад, калі крэдытны ліміт складае 50 млн рублёў, а вы «ўзялі» з яго толькі 20 млн рублёў, то і плаціць працэнты будзеце толькі за фактычна выкарыстаную суму. Падобная паслуга мае яшчэ адзін плюс: па меры карыстання крэдытам і гашэння яго, вы можаце зноў браць крэдыт на суму пагашаных грашовых сродкаў. Пры выкарыстанні крэдыткі спецыялісты раяць расплачвацца за тавары і паслугі менавіта безнаяўным шляхам, бо ў нашай краіне большасць банкаў пры крэдытаванні спаганяюць камісію за выдачу гатоўкі.

Можна аформіць авердрафт. Для гэтага нават неабавязкова ствараць крэдытку. Яго сутнасць у тым, што банк, у якім вы абслугоўваецеся ў рамках зарплатнага праекта, дадае да гэтай зарплатнай карткі некаторы крэдытны ліміт звыш рэшты вашых уласных сродкаў. Звычайна сума гэтага ліміту невялікая і залежыць ад вашай зарплаты. Атрымаць авердрафт нескладана: свой банк не патрабуе ад вас даведкі пра даходы. Да таго ж працэнтная стаўка, як правіла, ніжэйшая, чым па крэдытнай картцы, бо фінансавая ўстанова больш давярае супрацоўніку прадпрыемства, якое пастаянна абслугоўваецца ў банку. А вось калі вы атрымаеце зарплату, запазычанасць па авердрафту пагасіцца аўтаматычна. Аднак, спецыялісты фінансавага рынку не раяць «празмерна ўражлівым» асобам захапляцца крэдытнымі нагрузкамі. Калі ёсць крэдытная картка або авердрафт, то з'яўляецца адчуванне, што ты заўсёды пры грошах, і можна папросту «падсесці» на крэдытную «іголку» і празмерна завінавацілца.

### ЗА ШТО ПЛАЦІЦЬ І КОЛЬКІ?

Разнастайных камісій існуе вельмі шмат. Аднак гэта не азначае, што яны штодня будуць пераследваць па пятах трымальніка плацежнай карткі. Самая распаўсюджаная плата — за выпуск і абслугоўванне вашага пластыку. На другім месцы па частаце паўтаральнасці — камісія за выдачу наяўных грошай. Уладальніку карткі неабходна ўдакладніць у работнікаў свайго банка інфармацыю аб тым, ці ёсць у яго партнёрскія праграмы з іншымі банкамі, у межах якіх можна здымаць гатоўку бясплатна і ў банкаматах «чужых» банкаў. З камісіяй можна сутыкнуцца таксама пры праглядзе балансу і ў выпадку пераводу грашовых сродкаў з карткі аднаго банка на картку іншага. Напрыклад, адзін прагляд балансу карткі Тэхнабанка ў інфакіёску Беларусбанка будзе каштаваць кліенту 5900 рублёў (*меў такі ўласны досвед*. — **Аўт.**).

**З камісіяй можна сутыкнуцца таксама пры праглядзе балансу і ў выпадку пераводу грашовых сродкаў з карткі аднаго банка на картку іншага.**

Больш за тое, такія паслугі як інтэрнэт-банкінг і мабільны банкінг часам прапануюцца бясплатна, а часам — з абаненцкай платай. Калі вам часта спатрэбіцца карыстацца нейкімі нестандартнымі паслугамі — напрыклад, выпіскамі або даведкамі па рахунку на фірменным бланку банка, — раім загадзя ўдакладняць, ці бярэ банк плату за гэтыя паслугі, і калі так — то ў якім памеры.

### ЯК НЕ СТАЦЬ АХВЯРАЙ МАХЛЯРОЎ?

Скімеры (накладка на клавіятуру банкамата, унутры якой знаходзіцца прылада, што счытвае інфармацыю з магнітнай паласы плацежнай карткі), ліванскія завесы (блакіратары, якія ўводзяцца ў картапрыёмнік і перашкаджае вяртанню карткі з банкамата), траперы (блакіратары шатэра — адтуліны ў банкамаце, праз якую выдаюцца грошы) — вось тыя спосабы, якімі ашуканцы карыстаюцца часцей за ўсё. Нешта з гэтага можна выявіць і звычайнаму спажыўцу (напрыклад, накладку на клавіятуру), але ёсць нямала непрыкметных прылад, ды і тэхналогіі ўдасканальваюцца. Тым не менш можна засцерагчы сябе ад «падкопаў» махляроў.

**Падобная паслуга мае адзін плюс: па меры карыстання крэдытам і гашэння яго, вы можаце зноў браць крэдыт на суму пагашаных грашовых сродкаў.**

Па-першае, трэба падключыць sms-апавяшчэнне (вы будзеце ў курсе ўсіх аперацый, якія адбываюцца з банкаўскай карткай). Па-другое, неабходна вызначыць ліміты па тыпах аперацый (напрыклад, калі вы ў бліжэйшы час набыццё тавараў і паслуг збіраецеся ажыццяўляць выключна на тэрыторыі Беларусі, то лепш заблакіраваць міжнародныя транзакцыі). Па-трэцяе, добра мець картку з чыпам, а не з магнітнай паласой.

Спецыялісты раяць атрымаць у адным банку адразу некалькі картак. Так, адна на ўсё — гэта проста і зручна. Вядома ж, адзін пін-код запомніць прасцей. Але гэта звязана з вялікай рызыкай — і ў выпадку ашуканскіх аперацый, і пры банальнай страце банкаўскай карткі. У любым выпадку, калі вы перакананы прыхільнік наяўных грошай, то, страціўшы кашалёк, са 100% доляй верагоднасці страціце за адзін раз усе грошы. Разам з тым, калі б гэтыя ж грошы былі прывязаны да электроннага кашалька — пластыкавай карткі, то як мінімум частка сродкаў або як максімум усе сродкі вы маглі б выратаваць. Для гэтага ўсяго толькі неабходна ведаць элементарныя правілы бяспекі....

**Даведка**

**Фішынг (phishing, ад fishing — рыбная лоўля, вывуджванне) — від камп'ютарнага махлярства, асноўнай мэтай якога з'яўляецца прымушэнне ахвяры падманным шляхам даць ашуканцу патрэбную яму інфармацыю.**

### ПРЫКЛАДНЫ СЦЭНАР ФІШЫНГУ

Махляр стварае сайт, ідэнтычны афіцыйнаму вэб-рэсурсу (напрыклад, банка, паштоваму сэрвісу або сацыяльнай сетцы) і амаль з такім жа адрасам. Адзіная розніца ў тым, што падроблены сайт падрыхтаваны для нападу на наведвальніка.

Потым, пад выглядам афіцыйнага ліста з прапановай (напрыклад, атрымаць прыз або прачытаць важнае паведамленне) і замаскіраванай спасылкай на гэтую падробку, адпраўляецца на электронную пошту як мага большай колькасці патэнцыйных ахвяр. Далей з дапамогай разнастайных хітрыкаў (часта, з ужываннем метадаў сацыяльнай інжынерыі) махляр дамагаецца, каб ахвяра наведала інфікаваны сайт, устанавіла на свой камп'ютар якую-небудзь праграму, адкрыла файл, уласнаручна выдала паролі да акаўнтаў сацыяльных сетак, нумары банкаўскіх рахункаў, PIN-коды і многае іншае.

Перайшоўшы на шкодны сайт па атрыманай у лісце спасылцы, ахвяра ўводзіць свае даныя для ўваходу ў сістэму, якія пасля перапраўляюцца фішару, а ашуканы карыстальнік перанакіроўваецца ўжо на сапраўдную старонку арганізацыі, нават не западозрыўшы кепскае.

Сёння фішынг з'яўляецца адным з самых распаўсюджаных у свеце відаў кіберзлачынстваў, з дапамогай якога часцей за ўсё выкрадаюць акаўнты і банкаўскую інфармацыю.

* * *

***Чакаем вашых пытанняў пра карыстанне грашыма і ўсё, што з гэтым звязана. Вы можаце звяртацца на электронны адрас газеты info@zvyazda.minsk.by з пазнакай «для аддзела эканомікі» ці па тэлефонах: 8 017 287 17 51 і 8 017 292 38 02.***

**Сяргей КУРКАЧ**

■ Тэндэнцыі

# У АКТЫЎНЫМ ПОШУКУ

## Цяжкая ці складаная прамысловасць?

**Беларуская галіна цяжкай прамысловасці перажывае рэцэсію. Каб адрэгуляваць сітуацыю, найбуйнейшыя машынабудаўнікі праводзяць палітыку дыверсіфікацыі рынкаў экспарту. Таксама прыкметна скарачаецца імпарт грузавікоў. Як патлумачылі на вядучых машынабудаўнічых прадпрыемствах, негатыўная тэндэнцыя звязана ў першую чаргу з існуючай эканамічнай сітуацыяй у рэгіёнах продажаў.**

### АБ'ЁМЫ ПРОДАЖАЎ СКАРАЧАЮЦЦА

Найбольш ярка тэндэнцыі падзення продажаў адчуваюцца менавіта на рынках СНД. Яны з'яўляюцца асноўнымі для Беларусі. Так, расійскія вытворцы ў пачатку года некалькі разоў спынялі вытворчасць. Урад Расійскай Федэрацыі ў 2014 годзе накіраваў субсідыі ў памеры больш за 100 млрд расійскіх рублёў на падтрымку аўтавытворцаў і стымуляванне збыту. У сувязі з палітычным крызісам ва Украіне падзенне ёмістасці рынку камерцыйнай аўтатэхнікі ў шэрагу сегментаў складае больш за 90%. Для ААТ «МАЗ» на фарміраванне аб'ёмаў рынку ўплываюць фактары кшталту зніжэння тэмпаў росту ВУП асноўных краін — спажыўцоў аўтатэхнікі; дэвальвацыі нацыянальных валют; зніжэння коштаў і тарыфаў на сыравінныя рэсурсы; падзенне аб'ёмаў і рэнтабельнасці грузаперавозак аўтамабільным транспартам; палітычнай нестабільнасці ў шэрагу рэгіёнаў збыту; у сувязі з дэвальвацыяй нацыянальнай валюты тэнге (Казахстан) былі перагледжаны бюджэты дзяржаўных закупак у бок змяншэння, прыпынення выдачы крэдытаў на закупку аўтатэхнікі; эканамічных санкцый у дачыненні да шэрагу краін; негатыўных чаканняў спажыўцоў на асноўных рынках збыту ў сувязі з прыняццем захадаў падтрымкі нацыянальных аўтавытворцаў і абмежаваннем імпарту беларускай тэхнікі.

### ЧАС ЗАСВОЙВАЦЬ НОВЫЯ РЫНКІ

Нягледзячы на складаную рынкавую сітуацыю, МАЗ рэалізуе палітыку, накіраваную на стымуляванне продажу і павышэнне канкурэнтаздольнасці аўтатэхнікі. Каб пазбегнуць залежнасці ад паставак у Расію, ідзе пастаянны працэс асваення новых рынкаў. Пашырана геаграфія паставак за кошт Афганістана, Мазамбіка, Турцыі, Алжыра, Ганы, Малі, Камеруна і інш. Адкрыты чатыры прадстаўніцтвы: у ААЭ, Нігерыі, Гане, ПАР. Цяпер тэхніку і запасныя часткі да яе пастаўляюць больш чым у 50 краін. Да канца бягучага года адкрыюцца прадстаўніцтвы ў Саудаўскай Аравіі, Конга, Манголіі і Эквадоры. Што тычыцца БелАЗа, то на гэтым прадпрыемстве маюць намер выходзіць з аўтсорсінгам на рынкі Расіі і Казахстана. Гаворка ідзе пра класічны аўтсорсінг. У гэтым выпадку спажывец не закупляе тэхніку ў вытворцы, а звяртаецца да яго для атрымання платных паслуг. Па словах **Алега СЦЕПУКА, першага намесніка генеральнага дырэктара ААТ «БелАЗ» па тэхнічнай палітыцы і інавацыйных тэхналогіях**, у бок аўтсорсінгу прадпрыемства пайшло з-за пэўных складанасцяў рэалізацыі прадукцыі за наяўныя грошы.

«У нас ужо ёсць такі вопыт працы ў Беларусі. Даволі нядрэнна такая схема сёння працуе і ў Паўднёва-Афрыканскай Рэспубліцы, дзе ў нас каля 40 машын. Цяпер гэтую тэму мы развіваем і па Расійскай Федэрацыі, хочам таксама прыйсці з ёй у Казахстан», — адзначыў Алег Сцяпук.

У знешнегандлёвых аперацыях з грузавымі аўтамабілямі за студзень—верасень бягучага года таксама назіраецца значнае скарачэнне імпарту на фоне скарачэння экспарту. За гэты перыяд у адносінах да 2013 года пастаўлена на 1093 грузавыя аўтамабілі менш, што склала 6657 адзінак тэхнікі. У грашовым выражэнні экспарт зменшыўся на 154,5 млн долараў і склаў 690,6 млн. Імпарт грузавых аўто скараціўся на 18 901 адзінку тэхнікі і склаў 4591 грузавік. У грашовым выражэнні імпарт тэхнікі скараціўся на 213,6 млн і склаў 98,6 млн долараў. Асноўнымі рынкамі экспарту з'яўляюцца Расія, Казахстан, Украіна, Туркменістан, Кыргызстан, Боснія і Герцагавіна, Іран, Паўднёвая Афрыка. Асноўны імпарт ажыццяўляецца з Расіі і Казахстана, Германіі, Італіі, Польшчы. Па выніках працы Мінскага аўтамабільнага завода тэмп росту аб'ёму вытворчасці таварнай прадукцыі ў цэнах базіснага перыяду за студзень—жнівень 2014 года да адпаведнага перыяду 2013 года склаў 71% (у супастаўных цэнах — 73,6%). За гэты перыяд з канвеера сышлі 7697 аўтамабіляў (уключаючы машынакамплекты), выпушчана 2341 адзінка прычапной тэхнікі, уключаючы машынакамплекты, выраблена 925 аўтобусаў, 4 мікрааўтобусы і 159 аўтакранаў. На заводзе «Магілёўтрансмаш» (філіял МАЗа) выраблена 19 аўтапад'ёмнікаў, 18 машын для камунальнай гаспадаркі. Сярэднясутачны выпуск аўтамабіляў за жнівень 2014 года склаў 49,8 штук.



**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Грошы

# БЕСКАНТАКТНЫЯ КАРТКІ НАБЫВАЮЦЬ ПАПУЛЯРНАСЦЬ

**Сёння Беларусбанк выпускае падобныя плацежныя сродкі дзвюх найбуйнейшых міжнародных сістэм Visa і MasterCard. А цяпер бескантактныя карткі Visa Electron прапаноўваюцца ў межах пакета паслуг «Сучасны» (тэрмін дзеяння картак — 3 гады, рахунак — долары ЗША, еўра, расійскія альбо беларускія рублі).**

Бескантактныя карткі MasterCard Gold эмітуюцца ў межах двух пакетаў паслуг. Пакет «Прэстыж» прадугледжвае падобную картку з тэрмінам дзеяння 3 гады, дзе рахунак у доларах ЗША, еўра, расійскіх альбо беларускіх рублях. Картка пакета «Прэстыж плюс» мае ўжо тэрмін дзеяння 5 гадоў, а рахунак — беларускія рублі.

Усяго буйнейшым банкам краіны эмітавана больш за 11 тысяч бескантактнага «пластыку». У прэс-службе Беларусбанка ўдакладнілі, што бескантактнымі тэрміналамі абсталявана 736 арганізацый гандлю і сэрвісу па ўсёй тэрыторыі Беларусі. Цяпер банкам вядзецца работа па пашырэнні «бескантактнай» інфраструктуры.

**Сяргей ПАЛІНІН**

# Мінус 200 мільёнаў

**Па выніках лістапада золатавалютныя рэзервы Беларусі, згодна з метадалогіяй МВФ, зменшыліся на 202,9 млн долараў ЗША і, паводле папярэдніх звестак, на 1 снежня склалі 521,0 млн долараў ЗША ў эквіваленце.**

У нацыянальным вызначэнні рэзервы зменшыліся на 313,6 млн долараў і на 1 снежня склалі 6 408,7 млн долараў ЗША ў эквіваленце. «На зніжэнне аб'ёму золатавалютных рэзерваў у лістападзе паўплывала пагашэнне ўрадам і Нацыянальным банкам знешніх і ўнутраных абавязацельстваў у замежнай валюце ў поўным аб'ёме, — канстатуюць ва ўпраўленні інфармацыі і грамадскіх сувязяў Нацбанка. — Падтрыманню спрыяла рэфінансаванне абавязацельстваў Нацыянальнага банка, паступленне сродкаў ад продажу Міністэрствам фінансаў аблігацый, намінаваных у замежнай валюце, а таксама павелічэнне кошту золата на міжнародным рынку каштоўных металаў».

**Уладзіслаў КУЛЕЦКІ.**

■ На кантролі

# БОЛЬШАСЦЬ СКАРДЗЯЦЦА АБГРУНТАВАНА

**Сёлета толькі каля 12% зваротаў грамадзян у Камітэт дзяржаўнага кантролю Віцебскай вобласці прызнаны неабгрунтаванымі. Усяго ў кантрольным ведамстве зарэгістравалі каля 440 зваротаў, у тым ліку больш як 60 электронных. На асабістым прыёме пабывалі каля 260 чалавек.**

— Па традыцыі асноўную масу нараканняў выклікае праца «камуналкі». У асноўным людзі звярталіся з праблемамі нясвоечасовага рамонту жылля, добраўпарадкавання двароў і іншымі. Былі разгледжаны скаргі, звязаныя з зацягваннем тэрмінаў прыватызацыі жылля і нязгодай з коштам, — паведамілі нашаму карэспандэнту ў вышэйзгаданым камітэце.

Падчас разгляду аднаго са зваротаў выкрыліся абуральныя факты.

— У віцебскай камерцыйнай фірме заработную плату выплачвалі «ў канвертах». Падчас праверкі яе дзейнасці былі выяўлены і іншыя парушэнні ў сферы падатковага заканадаўства. Усяго па матэрыялах праверкі дадаткова налічылі падаткаў і пені ў суме каля 750 мільёнаў рублёў. Камітэт звяртае пільную ўвагу на якасць і паўнату адказаў, эфектыўнасць захадаў, якія прымаюцца па абароне правоў законных інтарэсаў грамадзян, — расказала **начальнік аддзела камітэта Аксана РУДНІЦКАЯ**.

Сёлета па выніках разгляду зваротаў грамадзян і правядзення праверак па пытаннях выканання заканадаўства ўжо прыцягнута да дысцыплінарнай адказнасці каля 30 службовых асоб.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Перспектыва

# ІДЭЯ БАНК ВЫРАШЫЎ ПАСЯБРАВАЦЬ З БІЗНЕСАМ

## Налета гэты фінансавы холдынг стане ўніверсальным

**Днямі акцыянернае таварыства «Ідэя Банк» адкрыла флагманскі Цэнтр абслугоўвання карпаратыўных кліентаў у Мінску, што стала першым практычным крокам па рэалізацыі праекта «Ідэя Банк Бізнес». Гэта частка плана ўкаранення стратэгіі холдынга па пераарыентацыі Ідэя Банка з рознічнага банка на ўніверсальны на рынку Беларусі.**

Менавіта ў 2015 годзе Ідэя Банк будзе развіваць гэты праект, які прадугледжвае асаблівую кіраўнічую мадэль з комплексам якасна новых падыходаў да працы з малым і сярэднім бізнесам. Мадэль заснавана на вопыце банка і тэхналогіях еўрапейскіх партнёраў, што дазваляе банку аптымізаваць рызыкі, павялічваць хуткасць прыняцця рашэнняў і абслугоўвання кліентаў. Дадатковыя магчымасці адкрывае наяўнасць замежнай крэдытнай лініі для падтрымкі малога і сярэдняга бізнесу.

У першую чаргу, мадэль прадугледжвае ўніверсальны падыход да крэдытавання карпаратыўных кліентаў. Гэта надае новыя магчымасці крэдытавання для кампаній, якія толькі выходзяць на беларускі рынак. Па-другое, рашэнне аб выдачы крэдыту да ста мільёнаў беларускіх рублёў прымаецца пры падачы толькі двух дакументаў — пасведчання аб рэгістрацыі прадпрымальніка і пашпарта. Папярэдняе рашэнне аб выдачы крэдыту ў памеры да двухсот мільёнаў рублёў можна атрымаць нават па тэлефоне. Па-трэцяе, кліент атрымлівае комплекс кансультацыйных і экспертных паслуг у асобе персанальнага менеджара, што павышае адказнасць банка і павялічвае хуткасць прыняцця рашэнняў.

**Сяргей КУРКАЧ**

**Даведка**

*Банк пачаў сваю дзейнасць пад брэндам «Сомбелбанк» у 2004 годзе. Праз 4 гады ён увайшоў у фінансавую карпарацыю Getin Holding SA. Яшчэ праз 5 гадоў быў перайменаваны ў «Ідэя Банк». За 10 гадоў дзеяння былі адкрыты падраздзяленні банка па ўсёй Беларусі, выдадзены мільённы крэдыт (верасень 2013 г.) і выпушчана 100 тысяч плацежных картак (кастрычнік 2013 г.). Паводле вынікаў дзейнасці за 2013 год, Ідэя Банк заняў першае месца ў рэйтынгу беларускіх банкаў і быў прызнаны банкам года на другой штогадовай прэміі «Банк года Беларусі» сёлета ў чэрвені. Таксама банку была прысуджана найвышэйшая ўзнагарода ў катэгорыі «Лепшы сэрвіс для фізічных асоб».*

■ Замежны вопыт

# ВЁСКА ВЫЙШЛА З ГАЛЕЧЫ ПРАЗ ГЛАБАЛЬНАЕ СЕЦІВА

## Кітайскія навінкі для беларускага інтэрнэту

**Праз інтэрнэт адкрываюцца магчымасці, якія дазваляюць пашырыць бізнес. Таксама менавіта праз сеціва замежныя рынкі становяцца бліжэй да беларускіх прадпрымальнікаў. Інтэрнэт-гандаль дазваляе звязаць кампаніі, абыходзячы пасярэднікаў, тым самым эканоміцца не толькі час, але і павялічваецца прыбытак для абодвух бакоў. Для вядзення бізнесу праз інтэрнэт неабходны спецыяльныя інфармацыйныя пляцоўкі. Адной з самых паспяховых сёння з'яўляецца Alibaba Group — кітайская публічная кампанія, якая працуе ў сферы інтэрнэт-камерцыі, уладальнік вэб-партала Alibaba.com. Яе сэрвісы дазваляюць гандляваць па ўсім свеце, насычаючы Кітай замежнымі таварамі, а таксама ствараючы ўсе магчымасці для экспарту.**




### З МАЛЕНЬКАЙ КВАТЭРЫ — НА ЎВЕСЬ СВЕТ

Калі Марк Завадскі, дырэктар AliExpress па развіцці бізнесу ў Расіі і СНД, запытаў усіх прысутных на канферэнцыі ў Мінску, хто з іх хоць аднойчы заказваў тавары на AliExpress — пераважная колькасць аўдыторыі паднялa свае рукі. Кампанія Alibaba Group, заснаваная ў 1999 годзе Джэкам Ма ў кватэры горада Ханджоў, цяпер мае рынaчны кошт каля 231 млрд долараў. Ёй належаць такія структуры, як: Alibaba.com — асноўны актыў кампаніі, гандлёвая пляцоўка для арганізацый; AliExpress.com — інтэрнэт-крама, якая прадае тавары ў розніцу і дробным оптам; Taobao.com — анлайн-рынак рознічнага гандлю, інтэрнэт-крама і інтэрнэт-аўкцыён; Tmall.com — гандлёвая пляцоўка; Alipay — платформа для анлайнавых электронных плацяжоў. У жніўні 2014 года сайт AliExpress аказаўся ў дзясятцы самых папулярных сайтаў рунэту. Колькасць актыўных пакупнікоў у экасістэме Alibaba складае каля 279 млн. Што робіць гэтую кампанію такой папулярнай ва ўсім свеце?

### КІТАЙ АБГАНЯЕ АМЕРЫКУ

Па словах Марка Завадскага, кампанія Alibaba імкнецца паспрыяць кругазвароту тавараў у свеце і прыбраць пасярэднікаў. Што тычыцца гісторыі развіцця Alibaba Group, то спачатку з'явілася кампанія Alibaba, класічная фірма класа B2B (кампаніі, якія працуюць неапасрэдна з іншымі кампаніямі), — інфармацыйная пляцоўка для прадпрыемстваў з Захаду, якія жадалі знайсці пастаўшчыкоў у Кітаі. Потым з'явіўся праект 1688 — сайт для кітайскіх кампаній, якія шукалі пастаўшчыкоў унутры Кітая. У той жа час з'явіўся праект B2C (кампаніі, якія працуюць са спажыўцом) Taobao. Потым у Alibaba зразумелі, што прапаноўваюць пляцоўку для зносін мала, а неабходна ўтрымліваць усе транзакцыі ў межах сваёй экасістэмы. Так з'явілася плацежная сістэма Alipay. І цяпер каля 70% разлікаў унутры пляцоўкі Alibaba адбываецца праз яе. Сайт AliExpress забяспечвае глабальных спажыўцоў кітайскімі таварамі. З іншага боку, сайт Tmall забяспечвае кітайцаў таварамі з іншых краін. І такая сістэма вельмі добра ўплывае на эканоміку. Цяпер Кітай з'яўляецца найбунейшым рынкам электроннага гандлю ў свеце і абганяе Амерыку па парытэце пакупніцкай здольнасці. У тым ліку Кітай абыходзіць ЗША па аб'ёме электроннай камерцыі. Паводле інфармацыі аналітыкаў, у 2013 годзе рынак інтэрнэт-гандлю Кітая перавысіў рынак Амерыкі на 24 мільярды долараў і склаў 287 млрд. Пры гэтым, у адрозненне ад ЗША, дзе доля анлайн-пакупнікоў складае больш за 70% ад усіх інтэрнэт-карыстальнікаў, у Кітаі такіх 60%.

**Для даведкі**

**Кампанія Alibaba фактычна стварыла сваю ўласную «Чорную пятніцу» (пятніца пасля Дня падзякі ў ЗША, з якой пачынаецца традыцыйны калядны сезон распродажаў), якая ў Кітаі выпала на святкаванне «Дня халасцякоў» 11 лістапада. У 2013-ы холдынг распаўсюдзіў сучасную практыку правядзення распродажу ў гонар «Дня халасцякоў» і на інтэрнэт. Такім чынам, дата 11.11.2013 адзначылася тым, што Кітай усталяваў сусветны рэкорд анлайн-продажаў у інтэрнэце і сабраў больш за 19,1 мільярда юаняў (3,1 мільярда долараў) у агульнай суме здзелак толькі за першую гадзіну работы. Тым самым Кітай перавысіў аб'ёмы гандлю «Чорнай пятніцы» ў ЗША.**

### МАГЧЫМАСЦІ ДЛЯ БЕЛАРУСКІХ ПРАДПРЫМАЛЬНІКАЎ

Вельмі прыкметным стаў сайт Taobao, які спачатку пазіцыяніраваўся як праект C2C(спажывец гандлюе са спажыўцом). На яго пляцоўцы кожны можа прадаць і купіць усё. Асаблівасцю гэтага праекта было тое, што ўвайсці ў яго вельмі проста. У гісторыі інтэрнэт-гандлю Кітая ёсць прыклады вёсак, якія выйшлі з галечы за кошт гандлю на Taobao. Затым у новым сегменце выказалі жаданне працаваць не толькі дробныя гандляры, але і кампаніі-брэнды, якім было выгадна прадаваць наўпрост кітайскім спажыўцам. Гэты праект атрымаў назву Tmall — інтэрнэт-пляцоўка класа B2C (кампаніі для спажыўца). І вось цяпер доля B2C павялічваецца, і ў ёй прадстаўлены найбуйнейшыя брэнды. У 2012 годзе Tmall запусціў новы праект, які будзе больш цікавы замежным кампаніям і інтэрнэт-парталам, якія не маюць свайго прадстаўніцтва ў Кітаі. Ён мае назву Tmall GLOBAL. Для працы з ім не трэба будзе прысутнічаць непасрэдна ў Кітаі, а толькі мець тавар, цікавы кітайскім спажыўцам. Што тычыцца беларускіх тавараў, то, па ацэнках спецыялістаў з Tmall GLOBAL, Кітай сёння зацікаўлены ў айчынных прадуктах харчавання, касметыцы, парфумерыі.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■ Кранальнае

# УСЛЕД ЗА ВЕТРАМ...

## Нават прыкаваны да ложка, Валодзя Ліс дорыць людзям радасць і светлую музыку

**Такога я нават у сне не магла сабе ўявіць. З нейкага хаосу гукаў на свет з'яўляецца стройная мелодыя. І дзе! У стэрыльнай палаце адной з лячэбных устаноў Бабруйска. Горада музыкантаў, амбіцыйных і ўпэўненых у сабе людзей. Ён з ліку іх. Знаёмцеся, дыджэй Валодзя Ліс! Як, вы яшчэ нічога аб ім не ведаеце? Дык гэта толькі справа часу. У наступным годзе выйдзе яго першы альбом. І тады... нават «аблокі затанцуюць»!**

### МЫ СЛУХАЕМ ВЕЦЕР

Бывае, бачыш кагосьці ўпершыню, а здаецца, што ведаеш гэтага чалавека ўсё жыццё. Вось і мы з Валодзем адразу ж перайшлі на «ты». Навошта нейкія там умоўнасці?

— Ты, напэўна, замерзла? Давай піць гарбату, — з гэтага пачалося наша знаёмства, калі я (і сапраўды амаль адубела ў рэйсавым аўтобусе), нарэшце, знайшла ў Бабруйску, не зусім вядомым мне горадзе, патрэбную ўстанову.

За вокнамі пахмурна, а мы п'ём гарачы напой і слухаем музыку. Хораша. Здаецца, ляціш на нейкім касмічным дыване-самалёце і ад навакольнай прыгажосці дух захоплівае.

— Табе падабаецца? Гэтую кампазіцыю я прысвяціў свайму сябру Валеру Аляксееву. Яна называецца «Вецер». Таму што Валера і вецер — гэта адно і тое ж, такі ж імклівы і непрадказальны. З ім ніколі не бывае сумна.

Адразу ж пазнала Валеру, калі ён, як вецер, і такі ж неўтаймаваны, як створаная для яго мелодыя, уварваўся ў палату. Уявіце сабе сумесь нейкіх хуткіх рухаў, гукаў, анекдотаў і гісторый. За 5 хвілін ён паспеў расказаць пра тэатр, Грышкаўца, узгадаць прытчу пра святара і залатыя зубы, праспяваць нешта на трасянцы і пры гэтым заварыць гарбату і паабдымацца з прыкаваным да ложка сябрам. Нельга не верыць яго абяцанням, што хутка ўсе даведаюцца пра дыджэя Валодзю. Ён не ён, калі гэтага не адбудзецца. Дзеля гэтага Валера, не самы багаты чалавек, гатоў знайсці сродкі і ўсім расказваць пра яшчэ адну зорку, якая заззяла на бабруйскім небасхіле.

— Вось так кожны дзень прыходзіць і пачынае свідраваць мне мазгі, — усміхаецца Валодзя. І я бачу, як гэта яму патрэбна.

Напэўна, калі б не тое няшчасце, аб якім Валодзя просіць не казаць (было і было), гэтыя два такія розныя і адначасова аднолькавыя чалавекі не сустрэліся б. І, магчыма, не было б тых «касмічных» мелодый, ад якіх мароз па скуры.

### САМЫ ЛЕПШЫ ДЗЕНЬ

Яго слабыя пальцы адмаўляюцца слухацца. Але насуперак гэтаму думкі светлага жыццялюба жывуць на яго старонцы «У Кантакце». Побач з пранізлівымі мелодыямі. Дзякуй усім тым, хто дапамагае Валодзю далучацца да сацыяльнай сеткі і «выказваць» думкі...

*«Я раней баяўся прызнацца вам, што я не магу варушыць нагамі і рукамі. Баяўся, што гэта адпудзіць ад маёй музыкі. Цяпер ужо не баюся.*

*Сядзелі неяк з Валерыем Аляксеевым. Гаманілі пра тое-сёе. І вось пра што я падумаў: «А які ў яго жыцці быў лепшы дзень?» Валера не змог адказаць. Я ўспомніў свой лепшы дзень. Не той, калі ў першы раз пацалаваў дзяўчыну. Не. Не першы школьны дзень і не выпускны. Не дзень нараджэння. Усё не тое... Той апошні дзень, калі я быў здаровым. Я гэты дзень успомніў цалкам. Амаль штохвілінна. Раніцай я быў звычайным чалавекам. Стаяў на зямлі, бачыў велізарнае неба, хадзіў. А ўвечары ўсё стала па-іншаму. Гэта быў самы лепшы дзень майго жыцця!*

*Цяпер усё змянілася. Мне грэх скардзіцца. Вакол мяне шмат добрых людзей. Я жыву добра. Мама і тата побач. І я сачыняю музыку. І дару яе вам. Я — шчаслівы чалавек...»*

— Нараджэнне музыкі — гэта таямніца, нешта асабістае, інтымнае, — усміхаецца Валодзя. — Ні адзін кампазітар не раскажа, як гэта адбываецца. Першы трэк мы напісалі год таму разам з Даніілам Бярозкіным. Да гэтай сустрэчы я толькі марыў быць дыджэем. А цяпер раблю тое, што нават здаровым не змог бы зрабіць. У мяне ж няма музычнай адукацыі. А тут — раз, і быццам усё з ног на галаву ўстала. Быццам нехта сказаў: пішы! Калі Валера прывёў Даніка, я не ведаў, што рабіць. Не хацелася, каб думалі, што я баязлівец. А потым сабраўся і пачаў працаваць...



Валодзя разам з сябрамі Аляксандрам КАСІНСКІМ і Валерыем АЛЯКСЕЕВЫМ.

Пакой № 227 — звычайная палата, іншымі словамі другі дом Валодзі. Насупраць ложка — вялікае акно, праз якое ён бачыць, як лета змяняе сумная восень. Круціцца таямнічае кола прыроды, але кожны дзень не падобны на іншыя. Таму што ёсць музыка. І ён вучыцца яе разумець. Прызнаецца, што шмат чаму навучыў яго Аляксандр Касінскі. Ён цэніць яго карысныя заўвагі і адчувае, наколькі вырас за апошні час.

— Я мару напісаць музыку пра Алісу, дзяўчыну майго дзяцінства, маё першае каханне, — прызнаецца ён. — Мне было 15 гадоў, ёй — 14. Я не ведаю, дзе яна, але засталіся ўспаміны аб тым бестурботным часе. Яна дарыла цёплыя пачуцці, ад якіх у душы ўсё спявала. І я чамусьці ўспомніў гэта.

Разам з Касінскім яны эксперыментуюць са стылем. Гэта нешта накшталт дабстэпу, трансу і тэхнастылю «ў адным флаконе».

### ТАЯМНІЧАЕ — ПОБАЧ

*«Іспанія. Ібіца. Вечар. Клуб. Людзі. Не, шмат людзей. Я за «круцёлкай». Іграю. Усе танцуюць. Я вам распавёў сваю мару дзяцінства... Не атрымалася. Сыграў толькі ў інтэрнаце адзін сэт. І ўсё. Ібіца пакуль нават не ўсміхнулася. Але...*

**Трэба радавацца кожнай галінцы, кожнай казюльцы, кожнай кропельцы дажджу. Не абмяжоўвайце сваю свабоду рознымі рэчамі.**

*Я выходжу іграць у дуэце з дэльфінам. А што? Калісьці ў дзяцінстве ў думках я адчуваў у сабе шалёную энергію. Цяпер усё па-іншаму. Першая частка скончана. Далей толькі гукі мора. Тое, што нам даў Божачка... Спявай, дэльфін. Не саромейся, сябра... Мне здаецца, што мы, людзі, часта не чуем чароўную музыку прыроды...»*

Мы сядзім насупраць і размаўляем аб усім. І раптам пачынаем гаварыць пра Бога.

— Я заўсёды верыў у Бога, але па-свойму, — прызнаецца Валодзя. — Думаў, ён ёсць — і добра. У царкву нават часам заходзіў. Бывала, едзем на машыне — мы ж былі «крутыя» пацаны! — а наперадзе — храм. Прыпыніліся, зайшлі, лягчэй стала і далей паехалі. Калі трапіў у бяду, першы час адмахваўся ад рэлігіі. А потым адна дзяўчына пазнаёміла з айцом Елісеем — і нешта змянілася ў душы. Гэта цудоўны бацюшка. Нават мой бацька, які скептычна ставіцца да святароў, слухаецца яго.

Задумацца аб сэнсе жыцця дапамагла і ўбачаная аднойчы перадача. Вельмі пераканаўча прагучалі словы нейкага багаслова пра стварэнне Сусвету. Ён казаў: «Людзі робяць шмат карысных рэчаў, ні адна з іх не з'явілася проста так, з паветра. Вось і планета наша, і ўвесь Сусвет не маглі ўзнікнуць самі па сабе. І існаваць таксама не маглі б, калі б таго не пажадаў іх Творца». Валодзя моцна задумаўся над гэтымі словамі і зразумеў: Бог ёсць.

— Людзі, на жаль, не цэняць тое, чым валодаюць, — сумна кажа ён. — Яны ж па-сапраўднаму свабодныя. Маюць магчымасць кудысьці выйсці. Трэба радавацца кожнай галінцы, кожнай казюльцы, кожнай кропельцы дажджу. Не абмяжоўвайце сваю свабоду рознымі рэчамі, не шукайце багацця, нейкіх там задавальненняў. Душа свабодная. А фізічна мы залежым ад усяго.

— А цябе можа нешта раззлаваць? — Валодзя на хвілінку задумваецца над пытаннем.

— Не ведаю. Напэўна, усё, як і парадаваць. Як звычайны чалавек, я залежу ад настрою. Сонца свеціць — радасна, дождж ідзе — сумна. А калі сонца няма колькі дзён запар, гэта мяне раздражняе. Яно ёсць — жыць весялей.

— Ты любіш жыццё?

— Я яго ўспрымаю такім, якім яно для мяне існуе.

— Ты верыш, што яно вечнае?

— Музыка была заўсёды, значыць, і жыццё вечнае. Я ніколі пра гэта не думаў. А выдумляць — грэх. Мы павінны не фантазіраваць, а... маліцца.

— Аб чым бы ты хацеў папрасіць Бога?

— Каб людзі ўбачылі той рай, які знаходзіцца ў іх пад нагамі, і не тапталі яго. Яны шукаюць чагосьці лепшага. Адсюль войны, наркотыкі. Уся наша планета — рай, але мы гэтага не бачым. Змей калісьці зайшоў у наш рай і яшчэ не пакінуў яго. Усё пачалося з яблыка, а скончылася тым, што мы маем, — нянавісцю, разбурэннем. Калі споўняцца ўсе жаданні чалавека, ён усё роўна не стане шчаслівым. Галоўнае багацце — гэта свабода, лёгкасць. А не тое, што можна прадаць ці купіць.

— Што ты параіў бы людзям, якія апынуліся ў такім жа становішчы, што і ты?

— Людзі, займіцеся справай, і будзе хацецца жыць, а не паміраць. А то, калі здарылася бяда, пачынаецца: «Я бедны і няшчасны, пашкадуйце мяне». Не трэба гэтага рабіць. Жывіце, пішыце вершы, музыку, фільмы, займіцеся чым-небудзь. Не трэба з нудой глядзець у столь. Ад гэтага ні вам лягчэй не стане, ні тым, хто вакол вас. Калі пачынаеш рабіць нешта, становішся чалавекам.

*«Калі на бераг выкідваюць рыбу, яна нешта яшчэ доўга лапоча, прагна хапае паветра, б'ецца хвастом. Вось так і я задыхаюся без музыкі. Толькі што спарадзіў у радасці другі трэк. Роды прымаў — Доктар Кос. Слухайце і не кажыце, што не чулі. Калі сачыняю музыку — я вольны. Слухайце. Можа, мы станем яшчэ бліжэй...»*

**Нэлі ЗІГУЛЯ. Фота аўтара.**

***P.S.*** *На развітанне Валодзя просіць больш пісаць не пра яго, а пра тое, што ёсць такія сябры, як Валера Аляксееў і Саша Касінскі. Ён вельмі ім удзячны. А яшчэ ўдзячны медработнікам, якія дапамагаюць яму ў жыцці. І з асаблівай цеплынёй успамінае сваіх бацькоў Алену Аляксандраўну і Уладзіміра Генадзевіча Пасталоўскіх. «Я стаю перад імі на каленях і не ведаю, чым аддзячыць за тое, што яны мяне не кінулі, — кажа Валодзя. — Я бачыў і такое... І няхай яны мне за ўсё даруюць»*

■ Ведай нашых!

# У фінале — тры беларускія каманды праграмістаў

**Каманда студэнтаў факультэта прыкладной матэматыкі і інфарматыкі БДУ ў складзе пяцікурснікаў Аляксея Колесава, Яўгена Грыцкевіча і чацвёртакурсніка Аляксандра Некрашэвіча выйшла ў фінал чэмпіянату свету па праграмаванні.**



Каманда БДУІР Belarusian SUIR #2 (Міхаіл Асташкевіч, Алег Танасюк, Данііл Беражноў і іх трэнер Аляксей Ропан) — у фінале.

Чэмпіянат свету па студэнцкім камандным праграмаванні ACM ICPC вядзе свой адлік з 1977 года. За прайшоўшы час праграмаванне пераўтварылася ў сапраўдны інтэлектуальны спорт. На працягу апошніх дзесяцігоддзяў чэмпіянат лічыцца адной з найбольш важных падзей у свеце праграмістаў. За спаборніцтвамі ўважліва сочаць не толькі сусветныя IT-карпарацыі, у ліку якіх Microsoft, IBM, Google, якія выступаюць спонсарамі чэмпіянату, але і ўсе, хто цікавіцца развіццём камп'ютарных тэхналогій.

У паўфінале дзейнічаюць тыя ж правілы, што і ў папярэдніх турах. У каманды з трох чалавек ёсць адзін камп'ютар і пяць гадзін на тое, каб рашыць як мага больш складаных задач за меншую колькасць часу. Правільна рэшанай лічыцца задача, якая прайшла ўсе тэсты, падрыхтаваныя членамі журы. У тым выпадку, калі каманды справіліся з аднолькавай колькасцю задач, перамога прысуджаецца камандзе, што паказала лепшы час і набрала менш штрафных хвілін.

Паўночна-ўсходні еўрапейскі паўфінал праходзіў адначасова ў Санкт-Пецярбургу, Барнауле, Тбілісі і Ташкенце. Усяго ў паўфінале чэмпіянату за 15 пуцёвак у фінал змагаліся 240 зборных. Беларусь прадстаўлялі 10 каманд: чатыры — ад БДУ, дзве — ад БДУІР і па адной — ад БДЭУ, Гомельскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Ф. Скарыны, Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта і Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы. Але згодна з правіламі спаборніцтваў, у фінал можа прайсці ад універсітэта толькі адна каманда, якая паказала найлепшы вынік. Таму канкуруюць паміж сабой і студэнты адной ВНУ.

Дарэчы, для студэнтаў БДУ гэта будзе ўжо 15-ы фінал. А менавіта для тройкі пераможцаў (Аляксея Колесава, Яўгена Грыцкевіча і Аляксандра Некрашэвіча) — другая заяўка на перамогу ў фінале (летась іх каманда была адзінай з Беларусі, якая трапіла ў фінал). **У гэтым годзе разам з імі ў фінал прабіліся яшчэ дзве беларускія каманды: каманда БДУІР і Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта. І гэта можна лічыць найлепшым вынікам за ўсе гады ўдзелу беларусаў у чэмпіянаце свету.**

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■ Да сустрэчы!

# Зіма. Натхненне. «Маладосць»

**Сустрэча супрацоўнікаў рэдакцыі часопіса «Маладосць» з першакурснікамі Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта прайшла незвычайна — па-першае, у Цэнтры беларускай культуры, а не ў аўдыторыі. Па-другое, у суправаджэнні выставы, прысвечанай «Маладосці» і МДЛУ адначасова, дакладней — іх супрацоўніцтву ў розныя гады.**

Таццяна Ваданосава, якая прадстаўляе аддзел гуманітарна-асветніцкай працы ўніверсітэцкай бібліятэкі, дала гасцям і гаспадарам сустрэчы магчымасць убачыць і нават пагартаць сапраўдны — фаліянтнага памеру альбом, у якім адлюстравана мінулае: фотаздымкі сустрэч з пісьменнікамі, рукапісныя водгукі, аўтографы і пажаданні. Сярод экспанатаў выставы — не толькі часопісы розных гадоў (установа выпісвае «Маладосць» з 1961-га), не толькі публікацыі пра ВНУ, але і... вытрымкі з «маладосцеўскага» сайта і нават яго адрас, ганарова і заўважна размешчаны ў самым цэнтры стэнда.





«Маладосць» даўно ўжо пакінула практыку гасцяваць у МДЛУ толькі раз на год — у межах прыдуманай імі акцыі «Вясна. Каханне. «Маладосць». У тым сэнсе, што цяпер творчыя і дзелавыя сустрэчы ў гэтых сценах ладзяцца вельмі часта — так часта, як могуць сустракацца сябры, якіх да таго ж аб'ядноўвае вялікая важная справа.

